Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІПЕНЬ 16 1933 г. НЯДЗЕЛЯ № 155 (4599) Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б АБ СТАНОВІШЧЫ ВІЦЕБСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ (1 стар.)

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Справа гонару кожнага калгасу, кожнага раёну, А. ДЖЭЛЮК—Клясавы вораг ля кніжнай паліцы (2 стар.). С. АГУРСКІ—Супроць бундаўскіх фальсыфікатараў гісторыі бальшавізму (3 стар.).

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегіі НК РСІ БССР аб забесьпячэньні саўгасаў, калгасаў, МТС і аднаасобнікаў машынамі і інвэнтаром да ўборачнай кампаніі (3 стар.).

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА—Пільнасьць вясковых парт'ячэек заваструць на барацьбу з буржуазнымі тэндэнцыямі (2 стар.).

САВЕЦКАЯ СУДОВАЯ СЫСТЭМА Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ЎРАДЖАЙ—Рабыё даклад нам. пракурора Саюзу тав. ВЫШЫНСКАГА. (4 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Антысавецкая хлусьня германскіх фашыстаў (4 стар.).

Фашысцкія бандыты расстрэльваюць камуністаў.

Лік бяздомных у Варшаве расьце (4 стар.).

СПРАВА ГОНАРУ КОЖНАГА КАЛГАСУ, КОЖНАГА РАЁНУ

Разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі ў БССР непарыўна зьвязана са стварэньнем моцнай кармовай базы.

Сапраўды змагацца за кармы для саўгасных і калгасных фэрм, для конскага стада калгасаў і саўгасаў, для жывёлы калгасьнікаў — значыць перш за ўсё накасіць, нарыхтаваць набольш сена.

Як-жа стаіць справа з правядзеньнем сенаўборкі ў нас, у БССР?

Ураджай траў у гэтым годзе надзвычай добры. У паўднёвых раёнах травы пачынаюць адцьвітаць. ТЭРМІНЫ СЕНАКАШЭНЬНЯ ПРАХОДЗЯЦЬ, А МАСАВАЯ СЕНАЎБОРКА ЯШЧЭ НЕ РАЗГОРНУТА.

Больш за ўсё адстаюць асноўныя жывёлагадоўчыя раёны БССР — РАГАЧОЎСКІ, БАБРУЙСКІ, МАЗЫРСКІ, ПЯТРЫКОЎСКІ, ЕЛЬСКІ і іншыя.

ДУБРОВЕНСКІ і ЖЛОБІНСКІ раёны дагэтуль нават зусім не разгарнулі масавай сенаўборкі.

Прырост за пяціднёўку самы мізэрны. Калі на 1 ліпеня па БССР было скошана 24.687 гэктараў — 1,4 проц., дык на 5 ліпеня скошана 68.974 га, або 3,9 проц., а на 10 ліпеня—172.228 га, або 9,8 проц.

Дзе прычыны такога ганебнага становішча з ходам сенаўборкі?

Перш за ўсё — у стаўцы на самацёк, у апартуністычных тэндэнцыях адпачыць пасьля сяўбы, у адсутнасьці сапраўднай барацьбы з кулацкімі спробамі зацягнуць сенаўборку.

Найбольш яркім прыкладам самазаспакаеньня пасьля сяўбы і зрыву ўборкі сенажацяй можа паслужыць РАГАЧОЎСКІ раён.

З 31.647 гэктараў сенажацяй у Рагачоўшчыне скошана ўсяго... 652. Райземаддзел ня мае ніякага ўяўленьня аб ходзе сенаўборкі ў калгасах. У раёне ёсьць 57 конных сенакасілак. Як яны скарыстоўваюцца — ні райза, ні МТС ня ведаюць. У раёне праяўляюцца антымэханізатарскія тэндэнцыі, навеяныя клясавым ворагам, накіраваныя на зрыў сенаўборкі. Пускаецца ў ход кулацкая «тэорыйка» аб тым, што «на нашых лугох касілка ня пойдзе». Чаго варты адзін той факт, што ў МТС восем адрамантаваных трактарных касілак і па сёнешні дзень ня выведзены на луг?

Або ўзяць ГАРАДОЦКІ раён. Тут касьба ідзе ўсьляпую. У раёне дагэтуль няма пляну сенаўборкі, калгасьнікі і аднаасобнікі заданьняў не атрымалі.

Даныя навукі гавораць, што зацяжка сенаўборкі, разрыў паміж касьбой і стагаваньнем прыводзіць да вялікіх страт. Сена траціць каля трэцяй часткі бялковых спажыўных матэрый. Між тым, першыя дні масавай сенаўборкі ўжо сыгналізуюць об небясьпечным зьявішчы — АБ ВЯЛІЗАРНЫМ РАЗРЫВЕ ПАМІЖ КАСЬБОЙ І СТАГАВАНЬНЕМ.

Дакладных даных аб колькасьці застагаванага сена ў Наркамземе няма. Зводкі тут складаюцца па-старому — указваецца толькі колькасьць скошаных гэктараў. А з месц атрымліваюцца весткі аб тым, што скошанае сена не стагуецца. Характэрнай ілюстрацыяй зьяўляецца ТАЛАЧЫНСКІ раён. У калгасах «Чырвоны партызан», «Бальшавік» і інш. скошанае сена ляжыць і па сёнешні дзень няўбраным у стагі, сена прамокла і сапсавалася. Аналягічнае становішча ў ЕЛЬСКІМ і радзе іншых раёнаў.

АРГАНІЗАВАЦЬ СУШКУ СЕНА, НЕ ДАПУСКАЦЬ РАЗРЫВУ ПАМІЖ КАСЬБОЙ І СТАГАВАНЬНЕМ — ГЭТА ВАЖНЕЙШАЕ ЗЬВЯНО Ў БАРАЦЬБЕ ЗА КАРМОВУЮ БАЗУ, ЗА ЯКАСЬЦЬ І КОЛЬКАСЬЦЬ СЕНА.

Правільная расстаноўка сіл на замацаваным за брыгадай пэўным вучастку сенажаці, разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва паміж брыгадамі — рашаючая ўмова для посьпеху сенаўборачных работ. Між тым, мы ўжо зараз маем рад фактаў у Жыткавіцкім і Рагачоўскім раёнах, калі паміж брыгадамі штодня пачынаюцца спрэчкі за кавалкі сенажацяй, кожная брыгада імкнецца захапіць лепшы кавалак. Гэта прыводзіць да дэзарганізацыі работ і самай агіднай абязьлічкі.

Сенаўборачныя работы павінна праводзіць пастаянная калгасная брыгада, да якой разам з палявымі павінны прымацоўвацца і сенакосныя вучасткі. Важна забясьпечыць разьбіўку брыгадны на зьвеньні, за кожным зьвяном замацаваць пэўны кавалак сенажаці. Трэба шырока скарыстаць на сенажацях вопыт прыёмкі работ па колькасьці і па якасьці.

З першых-жа дзён сенаўборкі клясавы вораг прабуе расьцягнуць, раскрасьці скошанае сена. АДНАК, АХОВА ЎРАДЖАЮ ПАСТАЎЛЕНА ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА. Напрыклад, у тым-жа Талачынскім раёне начныя пакражы прынялі сыстэматычны характар. У калгасах «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА», «БАЛЬШАВІК», «МАЯК» і іншых кожную ноч з пугоў зьнікае калгаснае сена. Арганізатары пакраж застаюцца нявыяўленымі і не пакаранымі.

Надзвычай яркі факт шкодніцкай тактыкі клясавага ворага меў месца ў калгасе ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА (Менскі раён). Кулак ПЯТКЕВІЧ і падкулачнік ФРАНЦКЕВІЧ укралі з калгаснага поля каля 20 пудоў канюшыны, па-шкодніцку скарыстаўшы для перавезлаў растучае тут-жа маладое жыта. Зладзеі былі затрыманы і панесьлі адпаведнае пакараньне.

Гэтыя факты паказваюць, што клясавы вораг шкодзіць калгаснаму будаўніцтву на кожным кроку, выбіраючы для гэтага найбольш слабыя зьвеньні. Паданыя факты патрабуюць ад партыйных і савецкіх арганізацый у вёсцы і ад саміх калгасьнікаў больш клясавай пільнасьці, быць на варце сацыялістычнага ўраджаю.

Вялікая колькасьць сенажацяй прыпадае на долю аднаасобнага сэктару, які павінен скасіць 863 тыс. гэктараў, усяго на тысячу гэктараў менш, чым калгасы. Між тым, у цэлым радзе раёнаў (Рагачоў, Талачын, Гарадок) аднаасобнік ігнаруецца. Аднаасобнікам яшчэ і зараз не адведзены вучасткі сенажацяй. Ня дзіва, што на 10 ліпеня аднаасобнікі скасілі ў пяць разоў менш, чым калгасы (аднаасобнікі — 25.922 гэктары, калгасы — 137.792 га).

Наколькі аднаасобнік скінут з рахунку паказвае і наступны факт: калгасы ўжо здалі дзяржаве 165 тон сена з першага ўкосу, а аднаасобнікі нічога не здалі.

Некалькі заўваг аб сеназдачы. Ужо зараз маюць месца антыдзяржаўныя тэндэнцыі, спробы ашукаць дзяржаву, здаць сена ніякай якасьці.

На віцебскі і плешчаніцкі загатпункты паступіла нікуды нявартае, зусім мокрае сена. Калгасы імя Беларускай дывізіі і «Колас», Менскага раёну здалі замест сена сырую мокрую траву. Барацьба з гэтымі кулацка-антыдзяржаўнымі тэндэнцыямі зусім не разгорнута.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваёй пастанове аб мерапрыемствах па правядзеньні сенаўборкі далі разгорнутую баявую праграму дзеяньняў.

Аднак, вышэйпаданыя факты настойліва сыгналізуюць аб тым, што большасьць цэнтральных і раённых арганізацый не зрабіла адпаведных вывадаў з пастановы партыі і ўраду.

УСЯКІМ ТЭНДЭНЦЫЯМ ЗАЦЯГНУЦЬ СЕНАЎБОРКУ, САМАЗАСПАКОІЦЦА, ЗРАБІЦЬ ПЕРАДЫШКУ ПАСЬЛЯ СЯЎБЫ ТРЭБА ДАЦЬ БЯЗЬЛІТАСНЫ АДПОР.

У БЛІЖЭЙШЫЯ-Ж ДНІ РАПАРТАВАЦЬ ПАРТЫІ АБ ПОЎНЫМ СКАНЧЭНЬНІ СЕНАЎБОРКІ І СЕНАЗДАЧЫ ДЗЯРЖАВЕ — СПРАВА ГОНАРУ КОЖНАГА САЎГАСУ І КАЛГАСУ, КОЖНАГА РАЁНУ.

Скошана толькі 9,8 проц. усёй сенажаці

ПАПЯРЭДЗІЦЬ ЗРЫЎ СЕНАЎБОРКІ, ЛІКВІДАВАЦЬ РАЗРЫЎ ПАМІЖ КАСЬБОЙ І СТАГАВАНЬНЕМ СЕНА

АХОВУ КАЛГАСНЫХ СЕНАЖАЦЯЎ ДАРУЧЫЦЬ ЛЕПШЫМ КАЛГАСЬНІКАМ

ГРУБАЕ ПАРУШЭНЬНЕ КАЛГАСНАГА ЗЯМЛЯКАРЫСТАНЬНЯ ЗРЫВАЕ СЕНАЎБОРКУ НА ВІЦЕБШЧЫНЕ

ВІЦЕБСК. (Ад нашага кар.)

Уборка сенажацяй у калгасе ІМЯ ЛЕНІНА, Бараўлянскага сельсавету, пачалася 8 ліпеня. Заданьні да брыгад былі даведзены толькі праз два дні пасьля пачатку касьбы—10 ліпеня.

Паводле заданьня першая брыгада павінна штодзённа ўбіраць ня менш 15 гэктараў. На справе-ж 10 ліпеня брыгада скасіла толькі... 2 гэктары. Брыгадзір Каралёў, павесяляючы праўленьню аб выкананьні дзённага заданьня, дадае, што ў брыгадзе 7 жанчын ня выйшлі на работу.

Першая брыгада не выключэньне. Другая брыгада, на чале з Шакалавым, скасіла за дзень 4 гэктары замест 27. І тут замест 36 жанчын выйшлі на работу толькі 20.

Ня лепш і ў брыгадзе № 3. Брыгадзір тав. Драздоў піша праўленьню калгасу: «Скошана 2,25 гэктара, заданьне 15 гэктараў. Зудаў Барыс з 9 гадзін не працаваў, Ганчароў спазьніўся на дзьве гадзіны, Буцько Марыя і Надзея на працу не зьявіліся, а в астатніх калгасьнікаў большасьць была занята рэзкай дроўдля сябе».

Што-ж робіць праўленьне, атрымліваючы такія трывожныя сыгналы ад брыгадзіраў аб сыстэматычным парушэньні працоўнай дысцыпліны і аб зрыве сенаўборкі?

Нічога. Яно падшывае зводкі да справы, складвае лічбы да лічбы і адсылае зводку ў сельсавет, сельсавет адсылае ў Віцебск, а Віцебск у Менск.

Ці зьдзіўляецца калгас імя Леніна выключэньнем на Віцебшчыне? Не. Масавае спазьненьне на работу, прагулы—пашыранае зьявішча ў Віцебскім раёне.

Аднэй з прычын зрыву сенаўборкі і масавага нявыхаду на работу зьяўляецца празьмерны рост прысядзібных вучасткаў, якія знаходзяцца ў карыстаньні калгасьнікаў.

Возьмем той-жа калгас імя Леніна. Тут фактычна прысядзібныя вучасткі адыгрываюць для калгасьнікаў галоўную ролю, а калгасная гаспадарка—дапаможную. Калгасьнік Шалапаеў Мірон па сваёй сядзібе заседаў жыта 0,24 га, ячменю—0,9 га, бульбы—0,38 га. Пасевы гэтыя так угноены, што ўраджай чакаецца на многа вышэйшы, чым у калгасе.

Шалапаева Ганна (сям'я—дзьве асобы) засеяла на прысядзібным вучастку 0,21 га ячменю, 0,26 бульбы. Калгасьнік Акімаў засеяў на сядзібе 0,19 га ячменю, 0,28 бульбы, 0,18 га гародніны. Усё гэта лепшая калгасная зямля.

Нарэшце, у самога брыгадзіра Шакалава, па яго прызнаньні, сядзіба дасягае 0,76 га, а па словах старшыні калгасу Чапялёнка—ня менш 1 гэктара. На гэтай сядзібе вы знойдзеце усё: і ячмень, і бульбу, і буракі, і капусту.

Вось чаму ў калгасе імя Леніна выхад на работу ганебны. Калгасьнікі працуюць на сваіх сядзібах-хутарох. Вось чаму ў калгасе на 10 ліпеня з 292 гэктараў сенажаці скошана каля 10 гэктараў.

Віцебскі гарком партыі павінен неад кладна выправіць гэтыя скажэньні ў парушэньні калгаснага зямлякарыстаньня.

А. М.

Аб становішчы Віцебскай партарганізацыі

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

Віцебская партарганізацыя, зьяўляючыся аднэй з буйнейшых пралетарскіх арганізацый КП(б)Б, па працяту апошніх двух год ня выходзіць з прарываў як у галіне прамысловасьці, так асабліва сельскай гаспадаркі. Маючы ўсе магчымасьці заняць перадавыя пазыцыі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва ў горадзе і па вёсцы і забясьпечыць вядучую ролю сярод паўночных раёнаў Беларусі, віцебская партарганізацыя, аднак, сыстэматычна, з кварталу ў квартал, ня выконвае прамфінпляну, асабліва на новых буйнейшых прадпрыемствах будаўніцтва першай пяцігодкі, дае вельмі нізкую якасьць прадукцыі, паставіўшы, напрыклад, буйнейшую фабрыку «Сьцяг індустрыялізацыі» перад пагрозай закрыцьця польтавага цэху ў выніку сыстэматычнага і зусім недапушчальнага, па рэзьмеру, выпуску браку.

Веснавую сяўбу, уборку і асабліва загатоўкі мінулага году віцебская партарганізацыя правяла выключна дрэнна, ня вытрымаўшы тэрмінаў, указаных партыяй і ўрадам і ня ўскрыўшы і ня выкрыўшы раду фактаў «очковтирательства» па сяўбе.

Першую веснавую сяўбу другой пяцігодкі, якая зьяўляецца бальшавіцкай праверкай работы і практычнага ажыцьцяўленьня гістарычных указаньняў тав. Сталіна аб рабоце ў вёсцы як КП(б)Б у цэлым, так і кожнай партарганізацыі ў асобку, віцебская партарганізацыя ганебна зацягнула, заняўшы ў тэмпах барацьбы за сяўбу і якасьць адно з самых апошніх месц у радох КП(б)Б.

Такое становішча важнейшых вучасткаў работы віцебскай партарганізацыі невыпадковае і зьяўляецца, галоўным чынам, вынікам таго, што партарганізацыя і ў першую чаргу яе раўніцтва гаркому партыі, гарКК і гарсавету ня ўлічыла ўсіх урокаў з памылак КП(б)Б па пытаньнях сяўбы, загатовак і нацпалітыкі, на якія ўказваў ЦК УсеКП(б) і якія асобна адзначылі лютаўскі і сакавіцкі пленумы ЦК КП(б)Б, мабілізуючы ўвагу ўсіх партарганізацый на неадкладнае і хутчэйшае іх выкананьне.

Кіраўніцтва віцебскай партарганізацыі ў асобе т. т. Міцькова, Кардашэнка і Вэнэля не зразумела і не ўзяло ўрокаў для сваёй работы з указаньняў ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б аб тым, што гніла-лібэральныя адносіны партыйных і савецкіх арганізацый да выкананьня асноўных гаспадарча-палітычных кампаній, да перараджэнцаў у радох партыі, да сабатажнікаў, да кулацка-нацыяналістычных элемэнтаў, якія прыкрываюцца фальшывана-цыянальным сьцягам,—зьяўляліся і зьяўляюцца яшчэ адной з асноўных прычын нашай слабай работы, адставаньня ў радзе важнейшых вучасткаў і патрабуюць самай рашучай барацьбы. Кіраўніцтва віцебскай арганізацыі ня толькі ня ўдарыла з усёй бальшавіцкай рашучасьцю па ўказаных недахопах, якія моцна ўстанавіліся ў радзе зьвеньняў віцебскай партарганізацыі і асабліва сярод часткі актыву, але і само праявіла, асабліва пры правядзеньні слабы, гніла лібэральныя адносіны да дробна-буржуазнай расхлябанасьці. Само кіраўніцтва не пабудавала сваёй работы на аснове апэрацыйнасьці і канкрэтных указаньняў. Характэрным для кожнай партарганізацыі, ня здолеўшай у рабоце па сяўбе паказаць бальшавіцкіх тэмпаў, зьяўляецца неразуменьне вялізарнага значэньня звышпраньняй сяўбы. Гэта ў вялікай ступені адносіцца да віцебскай партарганізацыі, кіраўніцтва якой ня толькі не ўзначаліла барацьбы за звышпраньнюю сяўбу, супроць кулацкага супраціўленьня і адсталых настрояў у радох партарганізацыі, але само аказалася ў палоне гэтых настрояў і ганебна зацягнула сяўбу.

Замест таго, каб узброіць усю партарганізацыю на барацьбу са спадчынай старога кіраўніцтва (Судакоў)—элемэнтамі сямейнасьці, групоўшчыны, балбатні, саноўна-панскіх адносін да работы, адрыву значнай часткі верхавіны партарганізацыі ад партыйных мас, замест таго, каб на аснове бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі выкрыць і ачысьціць рады партарганізацыі ад гнільля і перараджэнцаў, абапірціся на здаровую частку актыву і ўсёй партарганізацыі і перабудаваць усю работу ў адпаведнасьці з новымі задачамі партыі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва ў горадзе і ў вёсцы,—кіраўніцтва ў асобе т. т. Міцькова і Кардашэнка і большасьць членаў бюро гаркому цягнуліся ў хвасьце нездаровых настрояў у партарганізацыі, ня здолеўшы ўзьняць на прынцыповую вышыню цэлы рад пытаньняў, зьвязаных з работай і становішчам віцебскай партарганізацыі.

Такія сур'ёзныя зьявішчы ў жыцьці цэлага раду буйнейшых прадпрыемстваў прадпрыемстваў Віцебску, як значны адсеў камуністаў і камсамольцаў, якія дайшлі і атрымалі ацэнку з боку ЦК УсеКП(б), пасьпяшаць значнай часткі іх у рабоце, адрыў ад партнагрузкі—не атрымалі палітычнай прынцыповай ацэнкі гаркому і не паслужылі сыгналам да неадкладнай і рашучай праверкі ўсёй палітычнай, партыйнай і арганізацыйнай работы.

Ня гледзячы на рад сыгналаў аб нездавальняючай рабоце буйнейшых прадпрыемстваў («Сьцяг індустрыялізацыі», «Кім», «Дзьвіна» і г. д.) і яўна нездавальняючае становішча культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых і работы па палепшэньні снабжэньня іх, кіраўніцтва Віцебскага гаркому ня толькі не прад'явіла сур'ёзных канкрэтных патрабаваньняў да непасрэдных работнікаў прадпрыемстваў, але і ня здолела сур'ёзна паставіць ні аднаго пытаньня, якое-б сьведчыла аб уважлівых адносінах партарганізацыі і кіраўніцтва да пытаньняў прамысловасьці і патрэбаў рабочых. Наадварот, свае няўмелай арганізацыяй сяўбы ў каапгасах раду прадпрыемстваў і пастаноўкай работы самазагатовак віцебская партарганізацыя—у асобе яе кіраўніцтва — паказала няўменьне справіцца з задачамі барацьбы за прамфінплян і палепшэньне становішча рабочых.

Іменна за ўсё гэта бюро ЦК КП(б)Б аслабаніла т. т. Міцькова, Кардашэнка і Вэнэля ад кіраўніцтва Віцебскай партарганізацыяй.

ЦК КП(б)Б папярэджвае астатніх членаў бюро Віцебскага гаркому, аб тым, што яны ня менш адказны за становішча гаркому, чым т. т. Міцькоў, і Кардашэнка, і патрабуе неадкладна зьмены ўсёй практыкі работы бюро—перш за ўсё ў бок заспакоєньня бальшавіцкай прынцыповасьці, канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва і веданьня людзей. ЦК лічыць недапушчальным цяперашняе становішча апарату гаркому і патрабуе ўмацаваньня яго праверанымі работнікамі, дабіўшыся выразнасьці ў рабоце, веданьня жыцьця, становішча і работы як усёй партарганізацыі, так і асабліва работы на вёсцы і буйных прадпрыемствах. Бюро ЦК КП(б)Б даручае адзэлам ЦК разам з бюро гаркому намеціць да пераходзкі ў вёску як упутры раёну, так і ў другія раёны раду адказных работнікаў з гарадзкога актыву. Адначасова прапануе ўмацаваць работу па вылучэньні на раўшаючыя зьвеньні як партыйнага, так і гаспадарчага, прафсаюзнага апаратаў—лепшых праверанымі камуністаў, паказаўшых узоры работы на сваіх вучастках.

Бюро ЦК патрабуе ад віцебскай партарганізацыі ўзяць усе ўрокі з данай пастановы з тым, каб канчаткова ліквідаваць сыстэматычныя прарывы работы ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы Віцебскага раёну.

Асабліва ЦК патрабуе рашучай пералому ў пастаноўцы гаспадарча-палітычнай і партыйнай работы на такіх буйнейшых прадпрыемствах, як «КІМ», «Сьцяг індустрыялізацыі», «Дзьвіна», умацаваўшы іх лепшымі, праверанымі работнікамі па лініі гаспадарчай, прафэсыянальнай і партыйнай.

Бюро ЦК падкрэсьлівае неабходнасьць дабіцца ў бліжэйшы час рашучага павароту ў справе партыйна-масавай работы, сувязі з прадпрыемствамі, зьяўленьня недахопаў; неадкладна прыступіць да рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б), прыняўшай у сувязі з адсевам камуністаў і камсамольцаў у віцебскай арганізацыі.

Даручыць Віцебскаму ГК у бліжэйшы месяц разгледзець канкрэтна ўсе пытаньні, зьвязаныя з работай гаспадарчых, каапэрацыйных і прафсаюзных арганізацый у справе лепшай пастаноўкі пытаньня снабжэньня, абслугоўваньня рабочых, у першую чаргу на буйнейшых прадпрыемствах. Даручыць Белкаапсаюзу, Наркамлёгпраму і Наркамцяжпраму, прэзыдыуму ЦСПСБ аказаць усямернае падтрыманьне Віцебскаму гаркому і гарсаветам у гэтым пытаньні.

Надыходзячы перыяд уборачнай кампаніі і збожжаздачы стане баявой праверкай перабудовы радоў віцебскай партыйнай арганізацыі. ЦК лічыць, што віцебская партарганізацыя здолее пабальшавіцку падтрымаць новае кіраўніцтва, зрабіць усе вывады з данай пастановы і пабудаваць сваю работу так, каб забясьпечыць своячасовую ўборку ўраджаю і датэрміновае выкананьне ўсіх абавязацельстваў па здачы дзяржаве сельгаспрадукцыі.

Праходзячая чыстка віцебскай партарганізацыі паказвае наяўнасьць сярод паасобных членаў партыі буйдаўскіх настрояў, асабліва там, дзе буйдаўскія ўплывы на некаторыя зьвенні работы дагэтуль ня выкрыты. Партарганізацыі павінны на аснове бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі разгарнуць такую праверку работы ячэйкі і кожнага камуніста, якая-б забясьпечыла поўную магчымасьць сапраўды выкрыць і выгнаць з радоў партарганізацыі ўсё гніллё, перараджэнцаў, бюракратаў і маскуючыхся клясавых ворагаў, пралезшых у партыю, такую праверку, якая-б з усёй бальшавіцкай бязьлітаснасьцю ўдарыла па сямейнасьці, групоўшчыне, дробна-буржуазнай расхлябанасьці, маючых месца ў радзе зьвеньняў віцебскай партарганізацыі, павысіла-б клясавую палітычную пільнасьць кожнага камуніста і яго авангардную ролю на прадпрыемстве і ў сельскай гаспадарцы.

Бюро ЦК прапануе гэту пастанову шырока прапрацаваць ва ўсёй партарганізацыі і па гарпартактыве, партка

У ЦК УсеКП(б)

Аб становішчы ўліку камуністаў у віцебскай і кальчугінскай партарганізацыях

ЦК УсеКП(б) праверыў становішча ўліку камуністаў у віцебскай і кальчугінскай партарганізацыях. Аказалася ў наяўнасьці значна менш камуністаў, чым гэта лічылася па сьпісах. Апрача таго, выяўлен цэлы рад фактаў адрыву камуністаў ад партарганізацыі: некаторыя члены партыі не плацілі доўгі час членскіх узносаў, не наведвалі партсходаў, ня несьлі ніякіх нагрузак.

На кальчугінскім мэталязаводзе лічылася 2.179 камуністаў, фактычна аказалася на 300 чалавек менш. З гэтай колькасьці 171 чалавек пайшлі з заводу, ня зьняўшыся з вучоту. Наконт 190 камуністаў ні райком, ні ячэйкі ня ведаюць, у якіх цэхах яны працуюць і ці працуюць яны наогул на заводзе. Бюро парткалектыву фабрыкі «Дзьвіна», жадаючы выправіць недахопы партыйна-арганізацыйнай работы, кінулася ў другую крайнасьць, агульна выключыўшы з партыі за адрыў 30 камуністаў, у тым ліку і некаторых ударнікаў.

ЦК УсеКП(б), абмеркаваўшы указаныя факты, пастанавіў абвясьціць вымову за адсутнасьць кіраўніцтва пастаноўкай уліку і за слабасьць арганізацыйна-партыйнай работы сакратару віцебскага гаркому Міцькову і былому сакратару кальчугінскага РК Крапівіну. За фармальна-мэханічны падыход да рабочых-ударнікаў і агульнае выключэньне іх з партыі абвешчана вымова сакратару парткалектыву фабрыкі «Дзьвіна» тав. Вэксьлеру.

ЦК УсеКП(б) прапанаваў віцебскаму гаркому і кальчугінскаму райкому «неадкладна правесьці дакладную зьверку наяўнага складу членаў партарганізацыі і забясьпечыць дакладны апэрацыйны ўлік членаў і кандыдатаў партыі, арганізуючы не радзей аднаго разу ў тры месяцы праверку пастаноўкі гэтай справы ва ўсіх парт'ячэйках».

ЦК абавязаў гэтыя-ж парторганы «ў бліжэйшы час, асабліва ў сувязі з чысткай партыі, узьняць партыйна-арганізацыйную і выхаваўчую работу ва ўсіх парт'ячэйках з тым, каб забясьпечыць вывучэньне і ахоп партработай усіх членаў і кандыдатаў партыі на аснове індывідуальнага падыходу да кожнага з іх, а таксама лік віцаваць запазычанасьць па членскіх партыйных узносах.

НІ ПЛЯНАЎ, НІ РАБОТЫ

ГАРАДОК. (Наш кар.).

На 10 ліпеня па раёне калгасамі скошана 1.241 га сенажаці, аднаасобнікамі — 181 га, што складае 2 процанты арыентовачнага пляну.

У арыентовачны плян ніхто ня верыць, у тым ліку і аграном-плянавік Клёнская, бо ён быў складзен па неправерапых даных.

Аграном-плянавік Клёнская, называючы лічбу 7.991 гэктар, заяўляе, што плян не зацьверджан загадчыкам райза Смолічам, таму на месцы ня спушчан.

Касьба па Гарадоцкаму раёну знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Ня гледзячы на гэта райза на чале з загадчыкам Смолічам ня прымае ніякіх мер, каб паскорыць сенаўборку.

Лепшыя калгасьнікі—вартаўнікі сацыялістычнага ўраджаю

ПОЛАЦАК, 12. (Наш кар.). Калгасы Ветрыцкай МТС практычна прыступілі да ажыцьцяўленьня інструкцыі НКЗ СССР аб ахове калгасных ураджаяў. Так, у калгасах «КІМ», «Карла Маркса», «Ударнік» і інш. ужо вылучаны абазьчыкі з лепшых калгасьнікаў для аховы ўраджаю па корані. У першыя дні абазьчыкамі ўжо выяўлена і папярэджана некалькі спроб з боку кулацкіх элементаў пакрасьці калгасную маемасьць. Напрыклад, абазьчык Усьціновіч з калгасу «Карла Маркса» ўпочы затрымаў цьвёрдазаданьніка Астроўскага, які пасьвіў свайго каня на калгаснай сенажаці. Праз некалькі дзён было затрымана яшчэ чэцьвера коняй, якія таксама пасьвіліся на сенажаці. У калгасе «Кастрычнік» (Гомельскі сельсавет) быў затрыманы калгасьнік Яноўскі Міхась, які праз страху ўлез у сьвіран і ўкраў 5 пудоў ячменю.

Ф.

Неадкладна стагаваць высушанае сена

ЕЛЬСК, 12.

Аб марудных тэмпах сенаўборкі ў раёне «Зьвязда» пісала некалькі раз. Усё-ж да гэтага часу належнага пералому няма. Па апошніх даных плян уборкі выканан на адзін процант. Райза яшчэ не наладзіў дакладнага ўліку і на лежнага апэрацыйнага кіраўніцтва гэтай адказнай кампаніяй.

Першыя дні уборкі паказвалі, што ў радзе калгасаў дапускаюць вялікі разрыў паміж сенакашэньнем і стагаваньнем. Аднак, райза не зрабіў з гэтага адпаведных вывадаў. У рэзультаце высушанае сена ў некаторых калгасах пападае пад дождж. Напрыклад, у калгасе «Зьвязда» скошанае сена высахла, але па віне старшыні калгасу Скарасьцецкага сена не застагавана і да гэтага часу яно папала пад дождж, замокла і пачало псавацца.

Яшчэ горш адносяцца да сенаўборкі ў калгасе «Савецкая Беларусь». Па плану тут трэба ўбраць 135 га. Але чамусьці сенажаньные закладваецца да невядомага часу. Сіласаваньне таксама не пачата. Рабочая сіла не арганізавана і не расстаўлена на сваіх вучастках. Дзьве сенажасілкі абязьлічаны, стаяць не апледжанымі і не скарыстоўваюцца. А аб уборцы збожжавых у гэтым калгасе нусім ня думаюць. З дзьвёх жнівнарак адна яшчэ не адрамантавана, а для 50 калгасьніц не падрыхтаны сярпы. Старшыня праўленьня калгасу Пашэ праяўляе на гэтым адказнейшым вучастку выключную бязьдзейнасьць.

Ельскі.

Першачарговы абавязак—здаць пра дукцыю дзяржаве

РАГАЧОЎ. КАЛГАСЬНІКІ 2-ГА ВУЧАСТКУ РАГАЧОЎСКАЙ МТС НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ ПАСТАНАВІЛІ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ЦЬВЁРДЫХ ПАСТАВАК ЗБОЖЖА І БУЛЬБЫ РАНЕЙ ЎСТАНОЎЛЕНАГА ДЗЯРЖАВАЙ ТЭРМІНУ І ДА 20 ЖНІЎНЯ СКОНЧЫЦЬ ЗДАЧУ АЗІМЫХ КУЛЬТУР. НА САЦСПАБОРНІЦТВА ВЫКЛІКАНЫ ЎСЕ КАЛГАСЫ РАЁНУ.

СТРОНЕНКА.

***

КЛІМАВІЧЫ. КАЛГАСЫ КЛІМАЎШЧЫНЫ ПАЧАЛІ ЗДАЧУ СЕНА. ПЕРШЫМІ ЗДАЛІ ПРАДУКЦЫЮ КАЛГАС ІМЯ МОЛАТАВА, «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ», «ПРАЎДА» І «12-ТЫ КАСТРЫЧНІК» НА ПУНКТЫ ДАСТАЎЛЕНА ЗВЫШ 72 ЦЭНТ. СЕНА.

Кулацкае супраціўленьне мэханізацыі сенаўборкі

РАГАЧОЎ, 13. (Ад нашага кар.).

Рагачоўшчына ў гэтым годзе павінна скасіць 31.642 га сенажаці і сабраць 66.184 тоны сена.

15-е ліпеня — апошні кантрольны тэрмін сенаўборкі, вызначаны ЦК і СНК. Якое-ж становішча мы маем у раёне?

На 10-е ліпеня па Рагачоўшчыне скошана ўсяго 652 га сенажаці — 2,1 проц.

Ня гледзячы на самы разгар сенаўборкі, гэтай справай у раёне ніхто на кіруе. У райземаддзеле пасьля сяўбы парашылі адпачыць. Загадчык райза Жаўкоўскі, аграномы Маргалік, Гарбацзэвіч і інш. за апошні час у калгасах зусім ня бывалі. Кіраўніцтва сенаўборкай пушчана на самацёк.

У радзе калгасаў нагнядаецца супраціўленьне мэханізаванай уборцы сена. Высоўваецца кулацкая тэорыя аб тым, што «на нашых лугох касілка ня пойдзе».

З такімі разважаньнямі выступае старшыня калгасу «Друць» Краўцоў. Такія-ж тэндэнцыі нагнядаюцца і ў МТС. Зусім спраўныя 8 трактарных сенакасілак не скарыстоўваюцца і ляжаць без руху на вучастках МТС.

У раёне ёсьць 57 конных сенакасілак, з іх у калгасах МТС 27. Але ні дырэктар МТС Драчоў, ні загадчык райза Жаўкоўскі ня ведаюць, колькі сенакасілак працуе і колькі імі скошана.

У адным з буйнейшых калгасаў раёну «Інтэрнацыянал» дзьве сенакасілкі не працуюць. У калгасе «Праца», Ціхінніцкага сельсавету, канюшыну даўно можна было ўбраць сенакасілкай. Праўленьне калгасу ўсё чакае, сенакасілка не скарыстоўваецца.

На 10-е ліпеня па калгасах убрана ўсяго 282,5 га канюшыны—31 проц.

Зараз, калі касьба ў разгары, у раёне яшчэ ня скончан адвод сенажацяй. У вёсцы Канапліцы, Старасельскага сельсавету, аднаасобнікам не паказана, дзе касіць. Старшыня сельсавету Шышычын кожны дзень адкладвае гэту справу. Ня менш бюракратым праяўляе і райземаддзел. Саўгасу «Ціхінніцкі» вылучаны 25 га сенажаці з запаснога фонду, але вучастак для касьбы не адведзен. Дырэктар саўгасу Гоеў абіжае парогі райза, але ня можа дабіцца толку.

Рагачоўскі раён у часе веснавой сяўбы ішоў у калёне перадавых. Але пасьля сяўбы тут супакоіліся; парашылі відавочна зрабіць перадышку. Гэта прывяло да таго, што сенаўборка ў раёне пад пагрозай зрыву.

Раённы камітэт партыі павінен безадкладна ўжыць меры, дабіцца ў б

ПАРТЫИНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Пільнасьць вясковых парт'ячэек завастрыць на барацьбу з буржуазнымі тэндэнцыямі

ЗА ДАХОВУ, СВАЯЧАСОВУЮ ЎБОРКУ І ПАСТАЎКУ ПРАДУКЦЫІ ДЗЯРЖАВЕ

У барацьбе з кулацтвам загартоўваліся

ПОЛАЦАК (ад нашага спэц. кар).

На трыбуне—тав. ПАРФЕНАЎ. Першыя словы аўтобіяграфіі гаворацца го пасам з ноткамі хваляваньня. Потым, праз адну-дзьве мінуты, голас выраўноўваецца.

Дзіцячыя гады—поўны цяжкіх перажываньняў беднасьці. Юнацтва — на фабрыках і заводах былога Петраграду. У 1914 годзе Парфенава мабілізуюць на імпэрыялістычную вайну. У 1917 годзе ён разам з большавікамі павяртае зброю супроць клясавых ворагаў, за рабоча-сялянскі ўрад, за справу Леніна.

Упада заваляваньне. Парфенаў уступае ў чырвонагвардэйскі атрад, уліваецца ў рады маладой Чырвонай арміі. На франтох — да канчатковай перамогі над зграйай генэралаў, белапалякаў, да канца грамадзянскай вайны.

Пасьля дэмабілізацыі ён першы актывіст у вёсцы. Уступае ў партыю. У 1929 годзе першы ўступае ў калгас—і тут актывіст, ва ўсім прыклад.

А кулацтва, пры патураньні сельсавету і кіраўніцтва парт'ячэйкі, прапеза ў калгас і разбурае яго. Былы кіраўнік маёнтку Казімірава, дзе зараз цэнтр калгасу імя Сталіна, кулак Катовіч—арганізатар кулацкага шкодніцтва ў калгасе. У яго, Катовіча, зграя увасходзяць: кулак Якуцёнак, які становіцца паляводам, Папавы — былы жандар, Міхайлаў, Прахораў Рыгор, Елісеў Васіль, Янкоўскія Мікола і Язэп — усё мацерыя кулакі.

Яны змыкаюцца з кулацка-шкодніцкай групай настаўнікаў: Аляксейчыкам — былым белагвардэйскім афіцэрам, Брацьком — нацдэмам, Жураўлёвым кулаком, былым афіцэрам.

Пры дапамозе райпартарганізацыі гэта шкодніцкая група выкрыта і выгнана з калгасу. Але яны пасьпелі ўжо шмат калгаснага дабра згніаць, панкрасьці, разбазарыць. У выкрыцьці шкоднікаў немалую ролю адыграў Парфенаў.

Інчай пачынае працаваць калгас, ачышчаны ад клясавага ворага. Праца ідзе на аснове сацспаборніцтва-ударніцтва. Парфенаў—пепшы ініцыятар, застрэльшчык новых форм і мэтадаў работы.

— Якія пытаньні Парфенаву?—пытае камісія.

— Ніяхіх! Яго жыцьцё у нас як на далоні. Наш чалавек, узорны!

— Хто хоча выказацца?

— Тольні ў добры бок,—адказваюць галасы.

На трыбуне ХАХЛЕНКА. Гаварыць ня хоча, рэкамэндуе сябе няпісьменным. Камісія пытаньнямі ўзнае: бядняк, меў 2,5 гэкт. зямлі, пічыцца партызанам.

— Ці ёсьць дакуманты?—Пытае камісія.

— Няма!

— А ты скажы, ці заяваў з якім варгам?

— Чаму пакінуў партызанскі атрад?—пытаюць з залі.

Мяецца Хахленка.

— Заяваў з легіёнамі польскімі.

— Апо-ж у той час тут былі немцы.

Сьмех у залі...

Выступаюць калгасьнікі.

— На валікдзень п'янстваваў, зрываў работу. Ня прыклад калгасьнікам.

— Я — беспартыйны, — гаворыць тав. Палавы,—але Хахленка за мяне горш працуе.

— Рвач Хахленка. «Дай боты—пайду на працу»,—заляўляе ён часта.

— У партыі стаў кулацкім агентам, сваімі паводзінамі грае на руку клясавому ворагу. Тыповы перараджэнец.

Так характарызуюць Хахленку.

Правяраецца ЯЦКО—загадчык сямігодкі пры калгасе.

Аўтабіяграфію Яцко пачынае з дзеда.

— Дзед—кулак, меў 45 дзесяцін зямлі. Бацька... серадняк, меў чацьвертую частку. Бацька быў у калгасе, але выключан як... кулацкі элемэнт.

Сам Яцко вучыўся, вучыўся, вучыўся.

— Раскажы што ў цябе было ў час працы ў Лепелі?—пытае камісія.

Мяецца Яцко:

— Было глупства. Раскулачвалі. Быў «запаты кулак». Часы, зопата за брані. Я вярнуў. Частка прапала. Судзілі, потым... амністыя, вызвалілі. Вось і дакумэнцік, — выварачваецца Яцко.

— Наколькі засудзілі?

— 6 месяцаў пазбаўленьня волі.

Калгасьнікі і калгасьніцы зрываюць маску з ворага, які прыкрываецца партбілетам.

— Што рабіў у час уборкі, калі кулак разгарнуў шкодніцкую работу?

Нічога не рабіў Яцко. Патураў кулацтву.

Выразна аб гэтым гавораць беспартыйныя калгасьнікі і калгасьніцы.

Наступнай на трыбуне—калгасьніца-ударніца тав. ЧАР'КОВА КАЦЯРЫНА.

Кароткая аўтобіяграфія:

— Бацька—панскі батрак. Сама батрачыла. Выйшла замуж за батрака. Пры савецкай уладзе у мяне ўжо мелася зямля, пару кароў. У калгас уступіла ў партыю. Партарганізатар 4-ай брыгады. Ударніца.

— Пісьменнасьць якая?

— У 1932 годзе скончыла ў калгасе лікпункт.

Мала пытае камісія. Сход актыўны, гавораць самі калгасьнікі, калгасьніцы.

Тав. Кісялёў характарызуе Чарткову:

— Выдатная калгасьніца, прыкладная: устае а 3-ій гадзіне, бяжыць у брыгаду, а дзяцей у яе 4. Пакуль адчыніліся яслі, былі няпрыгледжаны. Зараз—у яслях.

Ёсьць і недахопы ў Чарткавай: працуючы на птушачай фэрме, не арганізавала добра ўлік курэй, лек. Былі па кражы. Гэта—недахоп, які трэба абавязкова выправіць.

З залі нясецца пытаньне:

— А колькі працадзён за месяц у Чарткавай-ударніцы?

— Чатыры.

Зацікавілася камісія,—у чым справа?

Аказваецца гэта проста шальмоўства. Чарткова працавала без прагулаў, штодзень, але ёй ня ўсе працадні запісалі і гэта не па недарэчнасьці, а ў чацьвёртай брыгадзе супроць Чарткавай арганізавалася група падкулачнікаў, якая і падстроіла гэта «гультайства», каб скампрамэтаваць яе на чыстцы.

Спроба ашальмаваць лепшую камуністку адбіта. Чарткова праверана: яна лепшая ўдарніца, першая жанчына — партарганізатар у калгасе. А яшчэ году няма, як была няпісьменнай! Так растуць савецкія жанчыны ў калгасах.

У гэты дзень прайшло чыстку яшчэ двое камуністаў парт'ячэйкі пры КАЛГАСЕ ІМЯ СТАЛІНА, ЮРАВІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ.

Што паказала чыстка?

Парт'ячэйка здолела зрабіць і ўзначаліць круты пералом у рабоце калгасу. Рэшткі кулацкага шкодніцтва ліквідаваны. Пры дапамозе палітаддзелу полацкай МТС, парт'ячэйка правільна расстаўляе сілы па брыгадах, арганізавала выпуск насьценных газэт у кожнай брыгадзе.

З адстаючых калгас імя Сталіна сёлета вышоў у рады перадавых. Сяўбу скончыў 23 мая. Скончана першая пра полка, заканчваецца другая. Скончана ворыва папару. У разгары сенакос. Ужо скошана звыш 50 гэктар. Да ўборкі збожжа падрыхтоўка завяршаецца. Жнівяркі, зернаўпавіцелі, косы, граблі, сярпы — усё ёсьць. Вылучаны вартаўнікі ўраджаю.

— Першы хлеб з поля—у малацілку, з пад малацілкі—дзяржаве. Да 1-га верасьня выканаць плян паставак збожжа—такую задачу паставіў сёлета калгас.

Ёсьць поўная ўпэўненасьць, што парт'ячэйка, пры дапамозе палітаддзелу МТС, ужо сёлета дабіецца, што калгас стане сапраўды бальшавіцкім, а калгасьнікі — заможнымі.

Кубліцкую парт'ячэйку трэба аздаравіць

ВУШАЧЫ.

Кубліцкая парт'ячэйка налічвае 12 членаў і кандыдатаў партыі і мае вялікі актыў калгасьнікаў. Яна мела ўсе магчымасьці, каб паказаць прыклад работы ўсім іншым вясковым ячэйкам і сельсаветам.

Але па справе парт'ячэйка на працягу 1932-33 г. у правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній ня вылазіць з прарываў.

У часе загатоўчай кампаніі парт'ячэйка і сельсавет не мабілізавалі калгасьнікаў, бедняко ў і серадняко ў—адназасобнікаў па рашучую барацьбу з кулацкім сабатажам загатовак. Наадварот, старшыня мясцовага савету Рутнэр займаўся апартуністычным разважаньнем аб нерэальнасьці пляну. Член бюро ячэйкі і член РКК Кляпец Д. была прымацавана да в. Пруды па правядзеньні загатовак і дэзэртыравала з гэтай работы. Сын кулака Іофэ, які ў той час быў сакратаром ячэйкі, таксама дэзэртыраваў з фронту загатовак.

За зацягваньне сяўбы сельсавет быў на чорнай дошцы, і зараз ячэйка не вядзе ўпартай барацьбы за свячасовую праполку, за скончаньне папаравай і сенакашэньня. Кіраўніцтва калгасу «Барацьбіт» да апошняга часу лічыла, што «яшчэ рана касіць, можа заўтра дождж будзе».

Парт'ячэйка ня прымае ўдзелу ў штодзённым жыцьці калгасу і зусім не займаецца справай калгаснай вытворчасьці. Паасобныя члены партыі, як Кляпец, Рутнэр і Іофэ мелі сувязь з кулацтвам, п'янствавалі і г. д.

Парт'ячэйка не вядзе барацьбы супроць антысэмітызму і шавінізму. За апошні час мы мелі адкрытае антысэміцкае выступленьне старшыні калгасу «Барацьбіт» Бабаева. Аб гэтым ведалі члены партыі Кляпец, Рутнэр, Іофэ і Качан, але мер да гэтага пяніх не прынялі.

Парт'ячэйка добра ведае, што старшыня арцелі саматужнікаў Белкінд займаецца шкодніцтвам, вядзе арцель да развалу, разбазарвае тавар, які прысылаецца для арцелі, меў растрату па сталоўцы. Але член бюро Іофэ, які зьяўляецца сваяком Белкінду, заўсёды яго абараняе.

Большасьць членаў і кандыдатаў партыі, ужо не гаворачы аб камсамольцах, калгасьніках і рабочых, ня ведаюць аб праходзячай чыстцы партыі. Масавай растлумачальнай работы вакол чысткі не праводзіцца, палітзаняткаў і ня думалі праводзіць.

Неабходна адзначыць, што раённыя арганізацыі і, у прыватнасьці ўпаўнаважаныя РК і РКК КП(б)Б, якія былі прымацаваны да гэтай ячэйкі, даўно ведаюць аб тых агідных справах, якія творацца ў кубліцкай парт'ячэйцы, але райком і РКК абмежаваліся толькі тым, што вынесьлі спагнаньні асобным членам ячэйкі.

Чыстка бязумоўна ўскрые ўсе гэтыя абуральныя факты і ачысьціць кубліцкую ячэйку ад разлажаўшыхся і клясава-варожых элемэнтаў.

Старадубаў.

Раўняцца па лепшых камуністах

Партыйная ячэйка саўгасу Дабрынь разгарнула масавую работу па падрыхтоўцы да чысткі партыі, зьвязаўшы ўсю работу з бальшавіцкай барацьбой за выкананьне заданьняў партыі.

Сацыялістычныя мэтады работы далі свае вынікі — плян веснавой сяўбы выкананы на 111 проц.

Зараз парт'ячэйка мабілізавала ўсю ўвагу рабочых на барацьбу з пустазельлем і падрыхтоўку да ўборачнай. Прапоты ўжо агароды і збожжавыя — ячмень, авёс, нераарана бульба. Скошана больш 120 га балотнай сенажаці і пастаўлена 30 стагоў сена. Скошана 75 га сенных траў.

Намесьнік дырэктара тав. Яры правіў сябе добрым арганізатарам рабочых мас у барацьбе за ўраджай. Прыклады бальшавіцкай барацьбы за разьвіцьцё жывёлагадоўлі паказала член партыі тав. Баркова, жая працуе жывёлаводам саўгасу. Баркова добра разумее задачу, якую паставіла партыя перад саўгасамі — максымальна павялічыць пагалоўе жывёлы. Яна дабілася захаваньня 164 штук цялят. Дзякуючы аддапай рабоце Барковай на малочнай фэрме павялічылі ўдой малака, перавыкананы плян здачы масла.

Але ня толькі на вытворчасьці Баркова зьяўляецца прыкладнай, усе ізтрыйныя нагрузкі яна таксама добра выконвае. Гэта лепшыя камуністы ў ячэйцы.

Але ячэйка ня здолела так наладзіць унутрыпартыйную работу, каб усе яе члены зьяўляліся прыкладнымі для рабочых мас. З чым прыдуць па чыстку члены партыі Танкевіч, Анішчанка Ліна, Анішчанка Сьцёпа? Яны ня хочуць хадзіць на сходы, ня выконваюць партнагрузак. Або Пярлова (кантралёр саўгасу), якая за ўвесь час сяўбы ні аднаго разу ня была на полі, не правярала якасьці работы, дрэнна кіруе насьценнай газэтай?

Змагаючыся за лепшую пастаноўку вытворчай работы, ячэйка не павінна ўпускаць задач унутрыпартыйнага выхаваньня камуністаў. Падрыхтоўку да чысткі трэба выкарыстаць для таго, каб узьняць партдысцыпліну ў сваіх радох, вывучыць твар кожнага члена ячэйкі, канкрэтна кіраваць іх работай.

Рабкор.

Рэдакцыя «ЗЬВЯЗДЫ уносіць у фонд пабудовы эскадрыльлі імя Кагановіча 1.000 рублёў і выклікае цэнтральныя газэты і ўсе рэспубліканскія гаспадарчыя арганізацыі пасьледаваць яе прыкладу.

Калектыў работнікаў рэдакцыі і канторы газэты «Зьвязда» ўносіць у фонд пабудовы эскадрыльлі імя Кагановіча 130 рублёў і выклікае работнікаў усіх цэнтральных і раённых газэт БССР.

„Першая запаведзь—выкаваньне пляну збожжазагатовак" (Сталін)

Бязьлітаснае выкараненьне буржуазных, антыдзяржаўных тэндэнцый, разгром манэўраў клясавага ворага—асноўная ўмова посьпеху ўборкі і цьвёрдых паставак

АШУКАНЦЫ ДЗЯРЖАВЫ ПАД АПЕКАЙ РАЁННЫХ КІРАЎНІКОЎ

КАМАРЫН. Кіраўніцтва Камарынскага раёну не ажыцьцявіла закону аб устанаўленьні ўстойлівага зямлякарыстаньня калгасаў. У выніку па раёне няма пэўнага ўліку ворнай зямлі. Плянавая бакханалія дайшла да таго, што агульны яравы клін у працэсе сяўбы зьменшыўся з 17 тыс. га да 11 тыс.

Кулацкія і антысавецкія элемэнты, скарыстаўшы адсутнасьць цьвёрдых меж калгасных зямель восеньню мінулага году і вясной г. г., самачынна захватвалі калгасныя землі і засявалі іх. Гэтыя вучасткі былі ўтоены ад уліку пры дачы абавязацельстваў па цьвёрдых пастаўках.

Прысядзібныя землі ў паасобных калгасах надзвычай раздуты. У калгасах «Чырвоны барацьбіт», «Інтэрнацыянал» і «Дняпроўскі араты» прысядзібныя «гародныя» землі дасягаюць да трох га. Прывядзем факты. Калгасьнік калгасу «Чырвоны барацьбіт» МІХАСЬ ХМЯЛЕНАК мае засеяную плошчу — ячменю 0,15 га, пшаніцы — 0,13, ільну — 0,08, пяньні — 0,06, бульбы — 0,26, жыта — 1,7 га, гародаў — 0,06. Калгасьнік ІОЎ ШАМ мае 0,03 га ячменю, 0,03 ільну, 0,17 бульбы, 0,07 проса, 0,035 гароду і 0,8 жыта. Такую-ж прыкладную плошчу засеялі калгасьнікі: Уладзімер Галка, Ануфры Яўхіменка, Кан цавы Андрэй і інш.

У калгасе «Інтэрнацыянал» калгасьнік Сьігін засеяў адзін каля 3 га.

У Баршчоўскім сельсавеце ёсьць рад выпадкаў, калі прысядзібныя вучасткі значна больш тэй зямлі, якую мелі калгасьнікі перад уступленьнем у калгас.

Гэта вельмі адмоўна адбілася на ходзе веснавой сяўбы і на іншых палявых работах.

Раённае кіраўніцтва аказалася проста на позадзе ў кулацкіх элемэнтаў. Сакратар РК Кавалёў засеяў для сябе вучастак бульбы на саўгаснай зямлі, прычым зямля апрацоўвалася рабочымі саўгасу.

Трэба яшчэ раз падкрэсьліць, што захваченыя землі і раздутыя прысядзібныя вучасткі ўтоены ад абкладаньня.

Неабходна прыняць неадкладныя рашучыя меры да ашуканцаў дзяржавы, якія імкнуцца сараваць цьвёрдыя паставкі. Трэба выкрываць кулацкія справы, якія маюць месца ў Камарыне.

Ц.

КУЛАЦКАЯ ДЗЯЛЁЖКА КАЛГАСНАЙ ЗЯМЛІ Ў СМАЛЯВІЦКІМ РАЁНЕ

СМАЛЯВІЧЫ. У радзе сельсаветаў раёну выяўлены агідныя парушэньні дырэктывы партыі аб землякарыстаньні калгасаў.

Замест бальшавіцкай барацьбы супроць кулацкай дзялёжкі калгаснай зямлі, барацьбы за недатыкальнасьць граніц калгасу, за ўстойлівае землякарыстаньне калгасаў, паасобныя сельсаветы і праўленьні калгасаў за няліся незаконнай абрэзкай абагуленай зямлі для дадатковай раздачы яе калгасьнікам. Тым самым яны фактычна садзейнічалі ператварэньню прысядзібнай гаспадаркі з падсобнай у асноўную.

Гэта вельмі пагубна адбілася на ўмацаваньні калектыўнай гаспадаркі, дапамагала кулацкай агітацыі за падрыў працоўнай дысцыпліны. Пры дапамозе буржуазных перараджэнцаў кулачво разлагала калгасы.

У калгасах «Ільліч» і «Ўперад» больш паловы калгасьнікаў былі заняты полівам уласных палёў і гародаў, у шкоду калгасным пасевам, якія парасьлі пустазельлем.

Акрамя таго, прырэзаныя калгасьнікам дадатковыя вучасткі не фігуравалі ў даных аб колькасьці пасеянай зямлі, былі ўтоены ад абкладаньня. Смалявіцкія перараджэнцы гэтым самым адкрыта ўступілі на шлях зла чынпага ашуканьня дзяржавы і ўтоўваньня збожжа.

Можна прывесьці рад прыкладаў, якія сьведчаць аб гэтым.

Праўленьні калгасаў імя «Молатава» (старшыня Лушчык) і «Чырвонаармеец» (старшыня Кірыльчык) Смалявіцкага сельсавету вясной гэта га году незаконна павялічылі прысядзібныя землі калгасьнікаў. Апошнім былі разданы дадатковыя вучасткі з абагуленага фонду палявых зямель.

Праўленьне калгасу «Ільліч». Ніліскага сельсавету (старшыня Граковіч) дало сельсавету сьпіс калгасьнікаў, якія маюць засеяныя прысядзібныя вучасткі. Літбы, даныя сельсаветам, яўна зьменшаны. Напрыклад, у Вінцэся Граковіча лічыцца прысядзібнай зямлі 0,42 га, пры праверцы аказалася 0,74, з іх пад пасевы бульбы і ячменю занята 0,6 га.

У Мікуліча Вінцэся лічыцца ўсёй плошчы 0,43 га, пры праверцы аказалася 0,75. Такім чынам праўленьне калгасу «Ільліч» занялося яўным ашуканствам дзяржавы з мэтай здаць менш прадукцыі. Больш таго, праўленьне раздала дадаткова зямлю з абагуленага фонду раду калгасьнікаў. Такі-ж малюнак выяўлен у калгасах «Чырвоны Усход» (старшыня Швэдаў), «Чырвоны штандар», «Уперад». Там прысядзібныя вучасткі складалі ва многіх выпадках ад 0,75 да 1 га.

Такім чынам у калгасах Плескага сельсавету пад апекай кіраўніцтва (старшыня сельсавету Кудзелька, сакратар Аларовіч) кулацкія агенты, буржуазныя перараджэнцы «ціхай сапай» падрывалі калгасную вытворчасьць. Карыстаючыся гнілым лібэралізмам сельсавету і ячэйкі, кулацкія агенты тварылі анты-калгасную, варожую справу.

Упаўнаважаны РК і РВК па веснавой сяўбе тав. Крэйзэльман, які прасядзеў каля 3 месяцаў у Юраўскім сельсавеце, ня толькі не рэагаваў на кулацкія справы, але сам даў шкодную ўстаноўку аб дадатковым надзяленьні калгасьнікаў зямлёй з абагуленага фонду.

Загадчык райза тав. Нішчык праявіў поўную бязьдзейнасьць у праверцы выкананьня дырэктыў аб калгасным землякарыстаньні.

Сакратар РК тав. Кудман, старшыня РВК тав. Казінцаў, старшыня РКК тав. Хадаркевіч абмежаваліся дачай агульных дырэктыў ячэйкам і сельсаветам і не рэагавалі свячасова на факты скрыўленьня дырэктыў партыі.

Ч.

Па сьлядох адзскіх перараджэнцаў

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваёй пастанове ад 1-га ліпеня з усёй вострасьцю паставілі пытаньне аб уліку ўраджаю, аб свячасовай дасьпілы правільных вестак аб ураджайнасьці. Адказнасьць за гэта важнейшае мерапрыемства партыяй і ўрадам ускладзена на сакратароў райкомаў і старшынь райвыканкомаў, на дырэктароў трэстаў і саўгасаў.

Ня гледзячы на гэта папярэджаньне, мы маем зноў рад спроб ашукаць дзяржаву.

Саўгас ВАСІЛЕЎСК Гомельскага раёну нядаўна прадставіў весткі па ўраджайнасьці: па жыту—6,5 цэнтн., па аўсе—6 цэнтн., віцы—5 цэнтн., гарошку—5,5 проц.

У сапраўднасьці пры праверцы старшынёй міжраённай камісіі па выкананьні ўраджайнасьці жыта ў саўгасе Васілеўск дае ня менш 8 цэнтн. з гэктара, авёс—9 цэнтн., віка—7 цэнтн.

Саўгас «ПРАЛЕТАРЫ» Гомельскага раёну апрача зьніжэньня ўраджайнасьці прадставіў і яшчэ фальшывыя весткі аб пагібелі ўраджаю азімых і яравых. Пры праверцы выявілася, што ўлік пашкоджаных плошчаў рабіўся «на вока».

У саўгасе «Новы шлях» Птушкатрусагадоўчага трэсту (Уваравіцкі раён) неогул парашылі, што займацца ўлікам ураджаю пішыня справа. Дырэктыву трэсту аб уліку ўраджайнасьці і формы ўліку дырэктар саўгасу НІКІФАРАЎ захаваў так, каб ніхто іх ня мог нават знайсьці.

Найбольш яркім прыкладам апартуністычных адносін да ўліку ўраджайнасьці можа паслужыць ГОМЕЛЬСКІ МАЛКАПРАМТРЭСТ. Маючы выстарчальны апарат, трэст за месяц праверыў улік відаў на ўраджай толькі ў чатырох саўгасах з 21.

На пытаньне, колькі саўгасаў праверыў дырэктар трэсту ЛАШКЕВІЧ, пасьпедаваў кпісьны адказ:

— Сам я ня быў ні ў адным саўгасе і не паеду, бо я не аграном. З мэй паездкі мала будзе толку, а за вызначэньне ўраджайнасьці адказваць ня зьбіраюся.

Ці патрэбны яшчэ камэнтары да гэтай махровай апартуністычнай установы?

У выніку такіх адносін дырэктара па ўсім трэсьце мы маем зьніжэньне відаў на ўраджай. Саўгасы РУДАКОВА, СТРЭЛІЧАВА, КІСЛЯЁЎКА і інш. прадставілі яўна зьніжаныя даныя аб ураджайнасьці. Ня гледзячы на гэта, ні адзін дырэктар саўгасу Лашкевічам ня прыцягнут да адказнасьці. Інакш як сьвядомым шкодніцтвам, як праднамераным ашуканствам дзяржавы, такую работу кваліфікаваць нельга.

Рад раёнаў дагэтуль упарта непрысылаюць вестак аб ураджайнасьці. Так, АСЬВЕЙСКІ, БЕШАНКОВІЦКІ, БЯЛЫНІЦКІ, БЯГОМЛЬСКІ, МСЬЦІСЛАЎСКІ, КРУПСКІ, АСІПАВІЦКІ, БЫХАЎСКІ, СТАРАДАРОСКІ і ГЛУСКІ раёны дагэтуль ні разу не прадставілі даных аб відах на ўраджай.

Паводле вестак міжраённых камісій па 30 раёнах мы маем наступныя віды на ўраджай: жыта азімае—8,6 цэнтн., пшаніца азімая—9 цэнтн., ячмень — 9,6 цэнтн., авёс—9,4 цэнт., пшаніца яравая—8,9 цэнт.

Гэтыя папярэднія даныя гавораць аб тым, што ў гэтым годзе мы маем па БССР добрыя віды на ўраджай. Там, дзе свячасова была праведзена сяўба і добрая апрацоўка глебы і выкананы аграмерапрыемствы, ураджай па ацэнцы саміх дырэктароў саўгасаў і калгасьнікаў чакаецца ў 15-20 цэнтн. з гэктара. Асабліва добрыя віды паказваюць раньнія пасевы аўса і ячменю.

Да ўборкі ўраджаю засталіся лічныя дні. Адстаючыя раёны павінны правесьці дасканалую праверку фактычнага становішча ўраджайнасьці. Партыйныя арганізацыі павінны даць бязьлітасны адпор апартуністам, перараджэнцам, усякім ашуканцам, якія працуюць утаіць сапраўдную ўраджайнасьць і ашукаць пралетарскую дзяржаву. Ніякай літасьці кулацкім агентам.

З.

А. ДЖЭЛЮК

Клясавы вораг ля кніжнай паліцы

Пачалося зусім з простых рэчаў.

Старшыня Дрысенскага райспажыўсаюзу т. Шапіра выклікаў да сябе ў кабінет інструктара па кніжнай справе Варановіча і загадаў:

— Ачысьціць кніжныя магазыны і крамы сельспажыўтаварыства ад непадробнай, палітычна шкодная літаратуры.

Між іншым ён зазначыў, што трэба тэрмінова максымальна зьмешчыць заставарэлыя кнігі, якое набыло вялікія памеры.

У дзяжмогу галоўнаму «чысьцільшчыку» па кніжнай справе быў запрошан спэцыяліст у такіх пытаньнях інструктар-лаўнаед Белкаапсаюзу Гарбадзей. На ўсіх сельскіх спажыўкаапэрацыях раёну быў дан строгі загад, які прадугледжвае за два-тры дні аднезьці у раённы цэнтр усе кнігі, што знаходзяцца ў крамах, для праверкі і выключэньня са сьпісу непатрэбных.

Вараноніч і Гарадзей «працавалі» дзень і ноч, не пакладаючы рук. Чысьцілі ўсё. Сьпісвалі ў макулатуру кнігі, пачынаючы ад твораў Леніна, Сталіна і канчаючы такімі кнігамі, як «Устройство простых сельско-хозяйственных машин». Разьмеры замакулятураванай літаратуры бязьмежна ўзрасталі. У гарачцы дрысенскія вараніны нават лічылі лішнім складаць акты на выключаныя кнігі, а проста валілі іх у скрыні пад прыступкі.

Нельга сказаць, каб спрытныя «чысьцільшчыкі» былі пазбаўлены палітычнага нораву і мастацкага густу.

У м. Дрыса для прасоўваньня ў масы выяўленчага мастацтва заводзіліся мастацкія альбомы (копіі карцін з Трэцякоўскай галярэі) з камэнтарамі на французкай мове коштам у 60-90 рублёў. Гэтыя выданьні не адзін раз праглядаліся, але яны заставаліся ляжаць нярухома на паліцах магазынаў. Ня ўнікаты-ж Варановіч і Гарадзей, што жыхары Дрысенскага раёну так «малакультурны», што ня купляць гэтых «спэцыяльных» выданьняў.

Для вёскі прызначаліся кнігі ў расхопных перапляётах, коштам ад 5 да 10 руб. кожная, такіх, прыкладна, назвы: «Диспокация жителей просных вод, начиная от амфибий и кончая пауками», або «Паталогия и физиология до машних животных»—падручнік для студэнтаў старшых курсаў вэтэрынарных інстытутаў.

Не забылі таксама і наконт «папулярных» кніг па фізкультуры, напрыклад «Бокс и французская борьба, их перспективы и значение».

Па частцы ідэалёгічнай выпрымаснасьці Варановіч і Гарадзей аказаліся на выдышні становішча. Яны проста і нядвухсэнсна выконвалі заказ свайго сябрата—кулака. І на самой справе, пасьля чысткі можна лёгка знайсьці па зьніжаных расцэнках кнігі прышчэпаўскіх выданьняў, накшталт «Как разбогатеть крестьянину от разведения пчел», або прышчэпаўска-кандрацьеўскі «справачнік жывёлавода за 1926 год», у якім у няпрыкрытай форме ідэалізуецца кулацкі тып гаспадаркі.

Творы такіх нацдэмаўскіх зуброў, як Чаржынскі, Байкоў і ім падобныя, свабодна папіраліся сярод насельніцтва. Нацыянал-дэмакратычнае ахвосьце праз гэтыя выданьні яшчэ раз прабівала ўзьнімць абшыпаны нацыянал-дэмакратычны сьцяг.

Чысьтка кніг ішла на двух шляхох: з аднаго боку, займаліся з продажу кнігі Леніна, Сталіна, пастановы партыйных зьездаў і іншая каштоўная літаратура, а з другога — выцягвалася на паліцу і прадавалася па патаннёных цэнах нацыянал-дэмакратычная кулацкая літаратура.

Ці ведалі пра гэта раённыя арганізацыі? Ці далі яны жалезны сакрушальны адпор гэтым контрэвалюцыйным дзеяньням?

Бязумоўна, ведалі.

Яшчэ 14 мая на раённай настаўніцкай канфэрэнцыі было ўзьнята пытаньне аб фактах шкодніцкай дзейнасьці з выключэньнем кніг. Да гэтага сыпнулу ад несьліся гмуха. Сакратар райкому тав. Будзін даручыў справу расьсьледаваць. Расьсьледаваньне рабілася так, што на працяму каля двух месяцаў ніхто не па цікавіўся яго рэзультатамі. І ў выніку ніяко было змазана.

І толькі 21 чэрвеня, калі ўмяшаліся ЦК партыі і «Зьвязда», быў укорыт ці лы ланцут фактаў шкодніцкай антысавецкай работы клясавага ворага, якая праводзілася пад простай апекай нашых лібэралаў.

Гэта-ж факт, што па Вальнецкім і Прудзінкаўскім сельспажыўтаварыствах зваліці ў макулатуру звыш 30 пудоў літаратуры. Сярод іх кнігі Леніна «Государство и революция», «Детская болезнь левизны в коммунизме», Сталіна «Об индустриализации страны и об правом уклоне», лёст тав. Сталіна у часопіс «Пролетарская революция», прамовы тав. Сталіна, Молатава і Арджанікідзэ на шарадзе гаспадарнікаў. Рэзалюцыі XVI зьезду партыі, праграма Камінтэрну і пастановы шостага кангрэсу ВККІ і цэлы рад іншых каштоўных выданьняў.

Нема магчымасьці ў газэтным артыкулі прывесьці сьпіс кніг, якія выкінуты ў Дрысе. Дайшло да таго, што такія клясычныя рэчы, як Чэхава «Смерть чиновника», Горкага і Рамэн Ралана «Об интервенции» і г. д., займаліся з продажу як палітычна-шкодная літаратура.

Палітычная сьлепата і тупасьць кіраўнічых работнікаў дайшла да апагею. Сакратар Прудзінкаўскай парт'ячэйкі Петрачэнка, калі яму заявілі, што з ма газыну выкідваюцца ленінскія і сталінскія кнігі, заявіў:

— Мяне гэта не датычыць. Ну, што-ж я мог зрабіць.

Загатчык арганізацыі райкому тав. Кацуба, будучы ўпаўнаважаным РК па масавай кампаніі ў гэтай сельсавеце, дзе шкодніці распраўляліся з кнігамі, ня толькі ня шукаў мер да прадухіленьня шкодніцкіх дзеяньняў з літаратурай, але наадварот, аднесься да гэтых фактаў выключна па-бюракратычнаму. Радавы члены партыі, якія заяўлялі яму аб гэтым, аказаліся на некалькі галоў вышэй гэтага тупалобага дзяржэ і райкому партыі.

Культпроп райкому, які даўно ведаў аб падобных фактах, ня толькі ня прыняў мер, але ўсякімі способамі стараўся змазаць гэту справу.

— У мяне ня было афіцыяльных даных і я ня мог стаўць на пасяджэньне райкому такое сур'ёзнае пытаньне. Вусная заява-ж камуніста яшчэ нічога не гаворыць. Так заявіў нам культпроп РК т. Новак.

Трэба спрацаць партыйную чуласьць, каб да падобнага сур'ёзнага факту аднесьціся так бюракратычна, як паступіў тав. культпропу райкому.

Старшыня Вальнецкага сельспажыўтаварыства Сушан—чалавек, які правяльзе ўсю работу, ня толькі ня цікавіўся кнігамі, але ўсьлых апраўдвае дзеяньні шкодніцкай. У гэтым сельсавеце жыўтаварыстве, побач з выключэньнем з продажу твораў Леніна і Сталіна і іншай каштоўнай партыйнай літаратуры, выяўлены кнігі, якія завоўніся з-за рубяжа. Гэтыя кнігі фашыстка-шавіністычнага характару ня раз перадаваліся ў кошце і свабодна прадаваліся з паліц сельскага спажывецкага кааператыву.

Раённ, якая павінна была асабліва чула і ўважліва рэагаваць на сыгналы з месц, зашчынула рэгіяд гэтага пытаньня. Яна сваёй непаваротлівасьцю патыбіла справу.

Да рэчы, па Дрысенскім раёне надзвычай дрэнна пастаўлена справа сваёй жаньня школ, хат-чытальняў і клюбаў марксыцка-ленінскай літаратурай. Тут шкодніцкія элемэнты найбольш моцна давалі сябе адчуваць. Нам прыходзілася сутыкацца з некалькімі школамі, калі выкладчыкі ў адзін голас заяўляюць, што яны ня маюць магчымасьці падрыхтавацца як сьлед да заняткаў, бо няма неабходнай літаратуры. Райана ня толькі не пакланяцца забясьпечыць школы каштоўнымі, партыйна-вытрымаными кнігамі, але наадварот, дзетрадізаваўшы ўсе срокі, ён пусьціў сумы, выдзяленыя на набыцьцё літаратуры, на іншыя мэты. Райпрафсавет—гэта пустое месца. Гэта арганізацыя ў поўным сэнсе гэтага слова ня цікавіцца, чым жыве маса членаў прафсаюзу, што яна чытае і якую літаратуру ёй падносяць у клюбах. Кіраўнікі райпрафсавету нават не маглі адказаць на пытаньне, колькі-ж прошак выдатавана на купаю необходнай літаратуры. Мы ўжо не гаворым аб тым, што прафсаюзныя бібліятэкі ў значнай ступені засмочаны клясава-варожымі кнігамі і райпрафсавет ня прымае ніякіх мер да ачысткі бібліятэк.

Нацыяналістычныя элемэнты старающа ўсялякімі сіламі затармазіць пра соўваньне кнігі на рускай мове ў масы. Гэта-ж факт, што па Дрысенскім раёне ны ні за якія пропы не пастанеце ні аднаго выданьня Леніна, Сталіна і каштоўнай мастацкай літаратуры на рускай мове. З гэтым праўленьнем нацыянал-дэмакратызму ў Дрысе не вядуць рашучай і бязьлітаснай барацьбы.

Мы асобна хочам спыніцца на гэй безадказнай рабоце, якая ёсьць у радзе цэнтральных кнігагандлёвых і кнігавыдавецкіх арганізацыях.

Возьмем БАКТ (беларускае аб'яднаньне культурных тавараў). Гэта яснаўная кнігараздзячая арганізацыя ў Беларусі. Яна сьлепа штампавала дырэктывы цэнтрвыдатаў Беларусі і РСФСР, якія пры сьпісваньні ў макулатуру выходзілі больш з камарцыйных, чым з палітычных меркаваньняў.

За адзін толькі 1933 год зьнята БАКТ'ам з продажу па Беларусі паводле указаньня «ОГИЗ'а» і ДВВ звыш 20 тыс. назваў. Сярод іх ёсьць вялізарная колькасьць каштоўнай партыйна-выцрымаанай літаратуры. Такія

НА ПАСТАНОВУ ПАРТЫІ І УРАДУ АБ ЧЫГУНАЧНЫМ ТРАНСПАРЦЕ АДКАЗАЦЬ КАНКРЭТНЫМІ СПРАВАМІ

Ні адзін ІТР яшчэ не перакінут на лінію

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Жлобінскі эксплёатацыйны раён ня выканаў пляну аздараўленьня паравозьнага і вагоннага парку першага паўгодзьдзя. Процант хворых паравозаў у першым квартале павінен быў складаць паводле нормы 0,9, было-ж 2,2. У другім квартале замест заданай нормы ў 1,33 проц. было 2,25. Па прычыне гарэньня буксаў адчэплена за паўгодзьдзе больш 1.300 вагонаў. Сярэдня-сутачны прастой таварнага вагона ў чаканьні рамонту складаў замест 4 гадзін 7 з паловай. Вось толькі некаторыя лічбы, якія сьведчаць аб значным адставаньні эксплёатацыйнага раёну.

У чым прычына такой дрэннай работы? Аб гэтым лепш за ўсё сказана ў пастанове СНК і ЦК УсеКП(б). Галоўнае — у старых мэтадах кіраўніцтва загадамі і дырэктывамі зьверху, у адсутнасьці інжынэрна-тэхнічных работнікаў у пізавых вытворчых адзінках. Начальнік аддзелу цягі тав. **Кавалёўскі** так захапіўся загадамі і дырэктывамі, што аб стане справы зусім ня ведае, бо ён на мясцох ня бываў, праверкі выкананьня дырэктыў не наладжваў. У гэты-ж час у апараце аддзелу цягі сядзяць лепшыя інжынэрна-тэхнічныя сілы, а на лініі іх зусім няма. Дагэтуль не перакінут на лінію яшчэ ні адзін работнік. Характэрна, што тэхнік Гапонаў, які скончыў тэхнікум шляхоў зносін, некалькі разоў узьнімаў пытаньне перад адміністрацыяй аб водпуску яго з апарату на вытворчасьць, але заўсёды атрымліваў адмоўны адказ.

Ёсьць простае скажэньне ў сыстэме заработнай платы. У той час, як тэхнік, які працуе ў апараце, атрымлівае 330 руб., тэхнік на вытворчасьці атрымлівае... 177 руб. Такое абураючае скажэньне сыстэмы аплаты працы ня сустрэла адпору з боку партыйных і прафсаюзных арганізацый.

Пастанова СНК і ЦК дала разгорнутую праграму перабудовы ўсёй работы чыгуначнага транспарту. Задача жлобінскай чыгуначнай партыйнай арганізацыі ўзначаліць перабудову на аснове гэтых пастаноў. Раней за ўсё трэба, не марудзячы, перакінуць інжынэрна-тэхнічных работнікаў з канцылярый на вытворчасьць, падабраўшы для гэтага найбольш здольных, перабудаваць сыстэму заработнай платы на аснове пастановы СНК і ЦК, кіраваць ня шляхам папяровых загадаў, а праверкай выкананьня.

Г. Ф.

ПЛЯН СПЭЦРАМОНТУ—ПАД УДАРАМ

Спэцыяльны аздаравіцельны рамонт паравозаў зьяўляецца адным з асноўных элементаў падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак. Даць здаровы паравоз грузапатокам восені і зімы—важнейшая задача чыгуначнікаў БССР. Дзеля зьвярнуўшы асноўную ўвагу на якасьць рамонту, павінна так арганізаваць работу, так расставіць рабочую сілу, каб прастой паравоза ў рамонце не перавышаў 72 гадзін.

Паводле пляну Менскага дэпо, праз спэцыяльны аздаравіцельны рамонт за красавік-ліпень месяцы павінна быць прапушчана 20 паравозаў з затратай 1.440 гадзін, або па 72 гадзіны на кожны паравоз.

Вынікі паказваюць, што кіраўніцтва дэпо невыстарчальна мабілізавалася для пасьпяховага правядзеньня спэцрамонту. Прастой значна вышэйшы, чым зададзена па норме. Так, паравоз С-У 200/94 прастаяў у рамонце 204 гадзіны. Газэта «Чырвоны чыгуначнік» своечасова сьвятлізавала аб перапрастоі паравоза ў рамонце, але сьпінал ня быў пачуты гаспадарчымі, партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі. Масы не мабілізаваны на барацьбу за своечасовы выпуск паравозаў з рамонту. Перапрастоі назіраюцца і зараз. Так, на рамонт 13-ці паравозаў патрачана 1627 гадзін пры нормі 866. Паравоз Щ-23/41 прастаяў у рамонце 106 гадзін, паравоз СВ-41/17—148 гадзін і г. д.

Кіраўніцтва дэпо не паклапацілася аб тым, каб своечасова і поўнасьцю забясьпечыць неабходнымі матэріяламі і запчастакамі спэцрамонт, не мабілізавала ўнутраных рэсурсаў для гэтага. Адсутнасьць матэріялаў і запчас так затрымлівае зараз работу.

Для правядзеньня ўсяго спэцрамонту былі спачатку вылучаны дзьве сьляпыя брыгады, але яны фактычна гэтым не займаюцца і спэцрамонт абязьлічан.

Якасьць рамонту—адна з важнейшых умоў бальшавіцкай сустрэчы асеньня-зімовых перавозак. Між тым, зменна якасьць—слабае зьвяно ў рабоце Менскага дэпо. Рамонт выконваецца недобраякасна. Ёсьць шмат паўторнасьцяй. На паравозе 23/41 пасьля спэцрамонту запісаны тры пункты паўторнасьці, на паравозе 41/17—два пункты. Наогул паўторнасьць пасьля аздаравіцельнага рамонту—частая зьява. У красавіку з 19 выпадкаў паўторнасьці 8 прыпадае на паравозы, якія прайшлі спэцрамонт.

Да гэтага часу ня складзен каляндарны плян правядзеньня рамонту кожнага паравозу паасобку, ня складзен індывідуальны графік рамонту. Папярэні агляд паравозаў не праводзіцца. Ніхто ня ведае, колькі патрэбна запчастак для правядзеньня рамонту. Пляны не даведзены да рабочых.

Партыйная арганізацыя Менскага дэпо пасьля на-бальшавіцку выправіць дапушчаныя недахопы. Пастанова ЦК і СНК аб чыгуначным транспарце павінна паслужыць моцным штуршком узьдыму работы і мабілізацыі мас на поўнае і добраякаснае выкананьне пляну аздараўленьня паравозаў. Трэба ўстанавіць строгі кантроль за якасьцю работы. Трэба наладзіць перадачу паравозаў, якія выходзяць з рамонту, па спэцыяльных актах прымацаваньня брыгадам.

В. Інге.

ЗРЫВАЮЧЫХ ВЫПУСК СТАБІЛЬНАГА ПАДРУЧНІКА—ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ

Зводка ходу выданьня падручнікаў на 14-VII-33 г.

Павінна быць надрукавана 100 падручнікаў з 2.800.000 тыражом.
Зданы ў друкарню 84 падручнікі.
Знаходзіцца ў рабоце ДВБ 6 падручнікаў.
У НКА на зацьвярджэньні — 9 падручнікаў.
У аўтараў — 2 падручнікі.
Усяго здана на базу 21 падручнік з тыражом 596.000.

Кантрольная лічба штодзённага выпуску:

па друкарні імя Сталіна на пляну	—	40.000 экз.
выпушчаны (1 падручнік)	—	35.700 экз.
па Палесдруку: па пляну	—	10.000;
выпушчана	—	0.

Загадчык вуч.-пэд. сэктарам **ДУБРАВІЦКІ.**

Зводка ходу выданьня падручнікаў, якую мы сёньня зьмяшчаем, сьведчыць аб надзвычай МАРУДНЫХ ТЭМПАХ выданьня падручнікаў. Гэта адносіцца і да ДВБ, дзе лішч знаходзіцца 6 падручнікаў і НКА, які яшчэ не зацьвердзіў 9 падручнікаў. Па сёньняшні дзень у аўтараў — 2 падручнікі. Дагэтуль АКАДЭМІЯ НАВУК НЕ ПРЫНЯЛА НІЯКІХ КРОКАЎ У ГАЛІНЕ ХУТЧЭЙШАГА ВЫПУСКУ БЕЛАРУСКАГА ПРАВАПІСУ. Адсутнасьць апошняга затрымлівае здачу ў друк 5-ці граматык. І гэта, ня гледзячы на тое, што гарком партыі абавязаў камуністаў Акадэміі Навук узначаліць справу па выданьні беларускага правапісу.

Са зводкі вуч.-пэдсэктару ДВБ відаць, што друкарня імя Сталіна павінна штодзённа выпускаць 40.000 падручнікаў. Між тым, у друкарні ідзе змаганьне за 35.000 падручнікаў, аб чым сьведчыць сыгнал трыкутніка друкарскага цэху ў апэрацыйным бюлетэні шматтыражкі за 13 ліпеня.

Гэты факт лішч раз сьведчыць аб тым, што ў ДВБ не пакончана з габінэтным кіраўніцтвам справай: работнікі НАВАТ НЕ МАГЛІ ДАГЭТУЛЬ ВЫЗНАЧАНУЮ КАНТРОЛЬНУЮ ЛІЧБУ 40 ТЫС. У ДЗЕНЬ ДАВЕСЬЦІ ДА ДРУКАРНІ.

Агідныя адносіны вучпэдсэктару да выданьня падручнікаў можна бачыць з чытанкі Каркадзіноўскай для IV групы. Апошняя друкавалася ў Гомелі, была запаказана для адпраўкі па раёнах. Вучпэдсэктар, заўважыўшы рад памылак на адной старонцы, распарадзіўся распакоўваць, адпраўляць у друкарню, вырэзваць брак, набіраць новую старонку і ўклейваць.

Пасьля сыгналаў «Зьвязды» падручнікі сушацца і мокрымі ўжо не адпраў ляюцца, але... як і раней друкарня амаль па кожнаму падручніку не дадае 5-10 ПРОЦ. тыражу. Тут вінават вялізарны процант браку ў пераплётным цэху: КАЛІ РАНЕЙ ПРЫЁМКА ЗАБРАКОЎВАЛА 8-10 ПРОЦ., ДЫК ЗА АПОШНІ ЧАС БРАК ДАСЯГАЕ 15-20 ПРОЦ.

Учора атрыманы тэлеграмы з Клімавіч і Рэчыцы аб тым, што райвыканкомы па-ранейшаму не выкупляюць прыбыўшых падручнікаў. ГЭТА ПРЫМУШАЕ НАС РАШУЧА СТАВІЦЬ ПЫТАНЬНЕ ПЕРАД ПРАКУРАТУРАЙ РЭСПУБЛІКІ АБ НЕАДКЛАДНЫМ ПРЫЦЯГНЕНЬНІ ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ ЗРЫЎШЧЫКАЎ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ І ЎРАДУ.

***

На апошнім пасяджэньні калегіі НКА пастаноўлена загадчыка вучпэдсэктарам ДВБ ГАЙДУКА за злачынныя адносіны да выданьня стабільных падручнікаў (друкаваньне пасьля пастановы ЦК УсеКП(б) старых падручнікаў, дрэнная якасьць перакладу і тэхнічнага афарміленьня асобных падручнікаў, пераплёт) З РАБОТЫ ЗЬНЯЦЬ, ПЕРАДАЎШЫ СПРАВУ АБ ІМ СЬЛЕДЧЫМ ОРГАНАМ.

Тав. Браўковічу прапанавана абавязкі загадчыка вучпэдсэктару ўскласьці на аднаго з членаў праўленьня ДВБ, забясьпечыўшы бесьперабойную работу вучпэдсэктару.

Цкаваньне за выкрытыя злачынствы

(Ліст селькора)

Доўгі час я зьяўляюся селькорам газэты «Калгасьнік Беларусі» і Горацкай раённай газэты «Ленінскі Шлях». У мінулым годзе мной выкрыт шпойнік у нашай камуне «Беларусь» (Чэрнеўскі с-савет), дзе кулакі і іх агенты, карыстаючыся прыгупленьнем клясавай пільнасьці мясцовых арганізацый і некаторых раённых работнікаў (**Зіншчыкаў, Радзюк — РСІ**), разбуралі гаспадарку камуны, псавалі машыны, інвэнтар, выводзілі са строю цягавую сілу, раскрадвалі камунальную маемасьць.

Сьвіньнік камуны, якім загадваў **Карпякоў С.**, быў даведзен да поўнага развалу. Карпякоў ня меў ніякага пакараньня за гэта і займае зараз пасаду загадчыка гаспадаркі камуны.

Загадчык прадуктовага складу **Лохманаў М.** разбазарыў 13 пудоў шпаніцы, значную колькасьць воўны, мёду і 4434 кгр. вотрубяй. Яму дапамагалі ў разбазараньні прадуктаў старшыня камуны **Кісьцяноў** і загадчык гаспадаркі **Карпякоў.** Яны атрымлівалі прадукты ў Лохманава ў неабмежаванай колькасьці.

Усе гэтыя злачынствы выкрыты мною на агульным сходзе камуны. Не спадабалася мая крытыка праўленьню камуны. Мяне і маю сям'ю пачалі цкаваць і пагражалі нават аддачай пад суд.

Па маёх допісах зараз частка злачынцаў прыцягнуты да адказнасьці, але цкаваньне ўсё-ж ня спынілася,—зьдзеек надамной і маёй сям'ёй працягваюцца. Праўленьне камуны прыпісвае прадукты, а сям'я іх зусім не атрымала. Калі мой бацька спрабаваў пярэчыць гэтым злачынствам, дык кіраўнік камуны яму заявіў: «не займайся агітацыяй, бо мы можам даць для цябе добрую пуцёўку—Салаўкі».

Самакрытыка ў камуне зацяснута. Калі выпуск нумар пасьцянгазэты, дык ён не павісеў нават піводнай гадзіны, адразу быў сарваны і зьнішчан.

Мой бацька добрасумленна працуе конюхам, але каб сфальсыфікаваць якое-небудзь злачынства, брат асуджанага Лохманава, **Лохманаў К.** разагнаў стада камунальных кароў, па табуну коней, якім пасьвіліся, а пасьля заявіў у праўленьне камуны, што быццам мой бацька жадаў гэтым самым пакалечыць стада. Усе гэтыя агіднасьці робяцца на вачох у Чэрнеўскай партыйнай ячэйкі, але ніякага рэагаваньня з яе боку няма. Асобныя камуністы гэтай ячэйкі разам з праўленьнем імкнуцца падабраць розныя фальшывыя падставы, каб выкліць маю сям'ю з калгаса.

На сходзе камуны 19 чэрвеня старшыня **Чысьцякоў** напіўшыся да непрытомнасьці, кідаўся на мяне з кулакамі, пагражаючы нейкай расправай.

Умовы, якія створаны для мяне і маёй сям'і, недаюць магчымасьці далей працаваць.

Бумажкоў.

Ад рэдакцыі

«Зьвязда» упэўнена, што Горацкая РКК-РСІ тэрмінова праверыць паданыя факты і вінаватых за зьдзекі над селькорам і іго сям'ёй прыцягне да суровай адказнасьці.

АБ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНІ САУГАСАУ, КАЛГАСАУ, МТС І АДНААСОБ НІКАЎ МАШЫНАМІ І ІНВЭНТАРОМ ДА УБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегіі НК РСІ БССР

Прэзыдыум ЦКК і калегія НК-РСІ адзначаюць, што дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 5 чэрвеня Белсельгаспадабам, белканторамі Саюзсельгаспадабамонту і Саюзсаўгасспадабу і Белкаапсаюзам ня выкананы і снабжэньне саўгасаў, МТС, калгасаў і аднаасобных гаспадарак уборачнымі машынамі, інвэнтаром, запаснымі часткамі да трактараў і ўборачных машын, шпагатам і іншымі матэріяламі пастаўлена пад вялікую пагрозу зрыву.

Праверкай устаноўлена:

1. Белсаўгасспадаб (кіраўнік т. Бімбад) ня мае дакладнага ўліку патрэбнасьці саўгасаў у машынах, інвэнтары і запчастках, а прычыны гэтага не прад ставіў і да гэтага часу абгрунтаваньня заяўкі на запчасткі ў Саюзсаўгасспадаб і гэтым замарудзіў завоз іх у БССР. Тав. Бімбад не забясьпечыў нармальнай бесьперабойнай работы канторы, не ўкамплектаваў штат і дапусьціў надзвычайную заблытанасьць у матэріяльным і фінансавым уліку і надзвычайны хаос на складзе менскай базы Саўгасспадабу. Прыбываючыя часткі не распакоўваюцца і не сартуюцца, складваюцца пад адкрытым небам, у грязь, затрымліваюцца па некалькі тыдняў на складзе і пакрываюцца іржой.

2. Сельгаспадаб (кіраўнік т. Жданаў) ня мае нарэйнага пляну снабжэньня, у выніку гэтага востра-дэфіцытныя запчасткі асядаюць на складах міжраёных баз (Ворша-Віцебск). Рэалізацыя машын, запчастак і іншых тавараў не арганізавана. З гэтай прычыны на 1 ліпеня застаюся нэрэалізаванымі 86 жнівярак, 64 сенажасілкі, 100 конных граблёў, 1676 акучнікаў, 600 палонкінкаў, 10 тыс. мётраў пасаў; між тым менская база ня можа задаволіць патрэб саўгасаў і калгасаў у пасах з-за адсутнасьці іх на базе. Агульнае затавараньне складаў больш 6 млн. руб. Адна к, Жданаў ня ведае, якія тавары залежваюцца і ня прымае мер да іх рэалізацыі.

У выніку злачынна-павольнай працы апарату стварыўся надзвычай востры недахоп у запасных частках да жнівярак і касілак; снабжэньне імі саўгасаў і калгасаў амаль спынілася.

3. Белснабрамонт (кіраўнік т. Будзкін) да гэтага часу ня мае пляну снабжэньня запчасткамі на 3 і 4 кварталы. Паступаючыя запчасткі па нарадах першага паўгодзьдзя завозяцца на склад Аршанскай базы, адкуль яны перапрадаўляюцца на менскую і гомельскую базы. Гэтым выклікаюцца нічым неапраўдваемыя бестаропкарчыя выдаткі па перагрузках, патрушках, перавозках і затрымваецца тэрмін прасоўваньня запчастак да саўгасаў і МТС. Побач з гэтым хаваньне запчастак на менскім складзе Сельснабрамонту пастаўлена выключна дрэнна, з прычыны чаго яны хутка пакрываюцца іржой і псуюцца.

4. Белкаапсаюз плян снабжэньня калгасаў, саўгасаў і аднаасобнікаў косамі, сярпамі, брускамі, малаткамі і г. д. сарваў. З 160.000 кос, падлягаючых завозу, завезена ў БССР 31.000, сярпоў завезена 23.250 штук, або 31 проц. пляну.

Белкаапсаюз замест бальшавіцкай барацьбы за своечасовую дастаўку ўборачнага інвэнтару, стаў на шлях бескарыснай і бясконцай перапіскі з вышэйшымі абадзіцыямі, абавязанымі адгрузіць косы і сярпы.

5. Заводы мэтэлнаб'яднаньня заказаў на запчасткі ня выканалі. Па заводу «Чырвоны барацьбіт» (Ворша) на 4 ліпеня зроблена крашэнтэйнаў рас. 72 шт. замест 500 штук, пасьцёрак цылінд рычных 294 замест 2.000, падвойных пасьцёрак 432 замест 4100.

Завод імя Варашылава (Бабруйск) пазнёсі зрабіць 5000 шт. угулак, а зроблена 775 шт. Завод імя Варашылава (Менск) заказ на 200 шт. калёс для жнівярак выканаў на 15 проц.

Прэзыдыум ЦКК і калегія НК РСІ адзначаюць, што трактарацэнтры і саўгастрэсты сыстэмы НКЗ не забясьпечылі своечасовага прадстаўленьня заказаў Сельгаспадабу і гэтым садзейнічалі на сутнасьці зрыву снабжэньня сельскай гаспадаркі сродкамі вытворчасьці.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што кіраўнікі снабжаючых і гаспадарчых арганізацый не зразумелі ўсёй адказнасьці за своечасовае і поўнае ўбраньне саўгасаў, МТС, калгасаў і аднаасобных гаспадарак сродкамі вытворчасьці, неабходнымі для бальшавіцкага правядзеньня ўборкі і папярэджаньня страт ураджаю.

Прэзыдыум ЦКК і калегія НК РСІ пастанаўляюць:

1. Кіраўніку Белсельгаспадабу т. Жданаву за зрыў снабжэньня саўгасаў, калгасаў і МТС дэфіцытнымі запаснымі часткамі, дрэнную рэалізацыю машын, насаў, вялікае затаварваньне і непрыняцьце адпаведных мер да рэалізацыі залежаў—абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем.

2. Дырэктару Саўгасспадаб т. Бімбаду за незабясьпячэньне своечасовага завозу запасных частак і снабжэньне імі саўгасаў, за непрыняцьце мер па наладжваньні нармальнай работы канторы і складаў, заблытанасьць уліку, дрэнае прасоўваньне запчастак да саўгасаў і дрэнае іх хаваньне—абвясьціць вымову.

3. Загадчыку менскага складу Саўгасспадабу т. Коціку за расхлябанасьць, за несваячасовую разборку прыбываючых запчастак, замарудзваньне іх на складзе, нядбайнае хаваньне запчастак і абсталяваньне складу — абвясьціць суровую вымову.

4. За зрыў снабжэньня МТС, саўгасаў і калгасаў запаснымі часткамі да трактароў, дрэнную арганізацыю прасоўваньня іх да спажыўца і выключна дрэннае хаваньне на складах—кіраўніку Белканторы Белсельнабрамонту т. Будзіку абвясьціць вымову.

5. Паказаць старшыні Белкаапсаюзу т. Царонку, што ён няе персональную адказнасьць за снабжэньне саўгасаў, калгасаў і аднаасобных гаспадарак да ўборачнай кампаніі.

Абавязаць тав. Царонку прыняць неадкладныя меры да выкананьня пляну снабжэньня гэтымі прадметамі сельскай гаспадаркі.

6. Абавязаць т. Будзіка (Белснабрамонт) не пазьней 8-га ліпеня прадставіць Саюзснабрамонту плян снабжэньня запчасткамі да трактароў на 3 і 4 кварталы бягучага году, арганізуючы завод запчастак непасрэдна на міжраённыя базы, недапускаючы канцэнтрацыі іх на Аршанскай цэнтральнай базе, як гэта было да гэтага часу.

7. Прапанаваць РКК-РСІ сумесна з палітаддзелямі МТС на працягу тыдня зрабіць праверку наяўнасьці запчастак па ўсіх МТС і МТМ з мэтай выяўленьня лішкаў іх, а т. Будзіку разам з Трактарацэнтрам арганізаваць пераразмеркаваньне лішкаў паміж МТМ і МТС.

8. Прасіць ЦКК НК-РСІ СССР прыняць меры праз Наркамзем СССР і Саюзснабрамонт да паскарэньня завозу ў БССР вострадэфіцытных трактарных запчастак (шатуны, шатунныя балты, подшыпнікі і інш.), шківаў для малацьбы, магнэто да трактароў ХТЗ.

9. Абавязаць кіраўніку сельгаспадабу не пазьней 10-VII даць міжраённым базам цьвёрдыя плянавыя заданьні па забесьпячэньні абслугоўваемых імі раёнаў машынамі, інвэнтаром і запчасткамі з разьлікам поўнага выкананьня меўшых месца фактаў асяданьня востра-дэфіцытных машын і часьцей у раёне месцазнаходжаньня базы.

10. Лічыць недапушчальным вызваленьне складжай сеткі Сельгаспадабу ад абавязкаў па снабжэньні сельскай гаспадаркі дробным інвэнтаром. Прасіць ЦКК УсеКП(б)-НК РСІ СССР у зьмену існуючага становішча абавязаць сыстэму Сельгаспадабу снабжаць саўгасы, калгасы і аднаасобнікаў сярпамі, косамі і інш. рэчамі.

Прапанаваць кіраўніку Сельгаспадабу на працягу трох дзён паставіць гэта пытаньне перад Саюзсельгаспадабам і дабіцца завозу кос, сярпоў, брускоў і г. д. на свае склады.

11. Абавязаць кіраўнікоў Сельгаспадабу і Саўгасспадабу не пазьней 20-VII завесьці ўсю патрэбную колькасьць інвэнтару і даставіць яго ў саўгасы і калгасы без затрымкі.

12. Прапанаваць т. Бімбаду ў трохдзённы тэрмін канчаткова дабіцца вызначэньня паўных фондаў машын і запасных частак праз саюзны Саўгасспадаб для саўгасаў БССР і неадкладны водпуск іх з заводаў з тым, каб уборачныя машыны (жнівяркі і снопавязалкі) прыбылі на месца не пазьней 20-VII, а запасныя часткі не пазьней 12-15 ліпеня, непасрэдна ў саўгасы, на працягу 24 гадзін паставіць сартыроўшчыка на склад, укамплектаваць штат канторы і наладзіць улік.

13. Прапанаваць т. Левіну (Белмэтаналаб'яднаньне) забясьпечыць канчатковую здачу заводамі: «Чырвоны барацьбіт», Гомсельмаш, «Рухавік рэвалюцыі», «Чырвоны мэталіст», імя Варашылава прынятых заказаў на запчасткі не пазьней 15-га ліпеня. Устанавіць штодзённую інфармацыю заводаў па выкананьні заказаў.

14. Абавязаць прамысловую групу ЦКК-НК РСІ Бел. на працягу 5-ці дзён зрабіць праверку выкананьня заказаў заводамі «Чырвоны барацьбіт» (Ворша), імя Варашылава (Менск) імя Варашылава (Бабруйск) і аб вынніках далажыць прэзыдыуму ЦКК.

15. У сувязі з пагражаючым становішчам і простай патрэбай абвалу складу Менскай базы Белснабрамонту—абавязаць менскі гарсавет (т. Каранеўскага) у пляніраваньні тэрмін прадставіць Белснабрамонту новае складачнае памяшканьне.

16. Прыняць да ведама, што Чашніцкай КК-РСІ райупаўнаважанаму Сельгаспадабу па Чашніцкім рабну т. Зайцаву за бяздзейнасьць у справе прасоўваньня ў калгасы машын, запчастак абвешчана суровая вымова.

17. Прыняць да ведама заяву начальніка тэхнічна-рамонтнага сэктару Белільнатрактарацэнтру т. Кушлаева аб тым, што міжраённыя базы Сельгаспадабу, атрымліваючы запчасткі з заводаў, пры разьмеркаваньні іх, падыходзяць падзяляцку а кузкаведамсьвеннага пункту гледжаньня і большасьць іх затрымліваюць у сябе.

Даручыць гомельскай і віцебскай гарКК, аршанскай і бабруйскай РКК-РСІ праверыць на месцы правільнасьць гэтай заявы і ў выпадку пацьвярджэньня прыцягнуць вінаватых да самай суровай адказнасьці.

18. Давесьці да ведама ЦКК-НК РСІ СССР аб тым, што ўстаноўлены парадак снабжэньня машынамі і запчасткамі саўгасаў сыстэмы Наркамсаўгасаў (вызначэньне фондаў для кожнага трэсту непасрэдна з Масквы) не дае магчымасьці манэўраваць імі ў межах БССР у адпаведнасьці з патрэбнасьцю саўгасаў.

Прасіць ЦКК-НК РСІ СССР скасаваць гэты парадак і даць указаньне Наркамсаўгасаў аб вызначэньні фондаў для саўгасаў БССР у цэлым з тым, каб разьмеркаваньне іх па трэстах праводзілася на месцы ў БССР.

19. Прымаючы пад увагу, што апарат Саўгасспадабу і яго міжраённых баз ня можа забясьпечыць бесьперабойнага снабжэньня саўгасаў патрэбнымі ім рэчамі, прапанаваць т. Бімбаду і т. Жданаву ў двухдзённы тэрмін устанавіць парадак снабжэньня саўгасаў праз склады Сельгаспадабу за кошт саўгасных фондаў, адпускаемых па лініі Саўгасспадабу.

20. Прызнаючы недапушчальным бранізаваньне ўборачных машын на складах, прапанаваць НКЗ неадкладна скасаваць такую практыку і рэалізаваць забраніраваныя машыны на агульных падставах.

21. Абавязаць кіраўніка Сельгаспадабу ў двухдзённы тэрмін вырашыць спрэчныя пытаньні з Гумтрэстам, выкупіць і даставіць на склады выпрацаваныя насы і аб выкананьні гэтага асобна далажыць прэзыдыуму ЦКК.

Нам. старшыні ЦКК КП(б)Б
нам. наркома РСІ БССР КОНІК.

С. АГУРСКІ

СУПРОЦЬ БУНДАЎСКІХ ФАЛЬСЫФІКАТАРАЎ ГІСТОРЫІ БАЛЬШАВІЗМУ

1.

Ужо дастаткова вядома, што ва многіх дасьледах па гісторыі партыі і рэвалюцыйнага рабочага руху яркі праяўляліся і праяўляюцца часамі і ў сучасны момант цэлы рад ухілаў, фальсыфікаваных, немарксыцкіх, антыленінскіх адценак, як гэта бліскуча даказаў тав. **Сталін** у сваім гістарычным лісьце ў рэдакцыю часопісі «Пролетарская революция».

Мы часта наглядаем поўнае скажэньне важнейшых фактаў і рэзка выяўлены антыпартыйны падыход у асьвятленьні гістарычных, рэвалюцыйных падзей. Такія ўхілы, такія скажэньні вельмі прыкметны ў частцы дасьледчых прац таварышоў камуністаў, якія зьяўляюцца выхадцамі з нацыяналістычных дробна-буржуазных партый. Сярод названых таварышоў ёсьць і такія, якія рознымі сродкамі стараюцца затушаваць сапраўдны клясавы характар арганізацый, якія выхавалі іх раней, імкнуцца «давесьці», што гэтыя арганізацыі былі самымі рэвалюцыйнымі, сапраўды марксыцкімі бальшавіцкімі арганізацыямі, імкнуцца давесьці, паводле трафарэта выразу тав. Пакроўскага («Ідэалёгічны фронт», «Правда» ад 7-XI—28 г.), «што яшчэ ў 1800 годзе дзяды іх былі марксыстамі».

Наколькі глыбока гэтыя тэндэнцыі прасякалі ў абсяг гістарычнай і дасьледчай работы, паказвае ідэалізацыя Бунду, Беларускай сацыялістычнай грамады, ППС і іншых, падобных да іх арганізацый. Гэтыя спробы асабліва рэльефна праявіліся за апошнія гады ў Беларусі, дзе рад таварышоў у замаскаванай, а часамі і ў адкрытай форме настойліва праводзяць тую думку, што бальшавізм на Беларусі вядзе свой пачатак ад мясцовага нацыянальна-адраджэнскага руху, ад мясцовага дробна-буржуазнага сацыялізму. Каб ня быць галаслоўным, спашлюся на факты, якія за апошнія гады асабліва праявіліся ў абсягу дасьледваньня гісторыі нашай партыі і рэвалюцыйнага руху.

Спынімся перш за ўсё на тым, як пад сьцягам бальшавізму некаторыя прапаведуюць чыстай вады бундызм і стараюцца захаваць бундаўскія традыцыі ў нашых радох.

Хто больш ці менш знаёмы з гісторыяй нашай партыі, той ведае, што Бунд, які быў заснован у 1887 годзе, як эканамічная арганізацыя яўрэйскіх рамесьнікаў, на сваім першым зьезьдзе баяўся нават назваць сябе сацыял-дэмакратычнай арганізацыяй і таму пастанавіў назвацца «Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз». Гэта назва павінна была гарантаваць ад тэй небясьпекі, каб часамі яўрэйскія рамесьнікі не маглі разглядаць Бунд, як сацыял-дэмакратычную арганізацыю. Апрача таго, арганізатары Бунду з самага пачатку паклалі ў аснову сваёй праграмы наскрозь апартуністычную шпаргалку Мартава, якая выказана ім у прамове, сказанай на першамайскім сходзе ў Вільні ў 1895 годзе.

У гэтай прамове ён гаварыў, што «яўрэйскія рабочыя павінны стварыць спэцыяльную рабочую арганізацыю, якая мусіць стаць кіраўніцай і выхаваўцам яўрэйскага пралетарыяту ў яго барацьбе за эканамічнае, грамадзянскае і палітычнае вызваленьне, бо калі рускаму пралетарыяту прыдзецца ахвяраваць, каб дасягнуць якіх-небудзь паляпшэньняў праз адно якое-небудзь са сваіх патрабаваньняў, дык ён у такім выпадку ахвотней ахвяруе тыя патрабаваньні, якія датычаць спэцыяльна яўрэяў»...

Праўда, у самым раньнім пэрыядзе існаваньня Бунду плынь, якая высоўвала на першы плян спэцыфічныя задачы яўрэйскага пралетарыяту, яшчэ ня была пануючай плыньню, чым, такім чынам і тлумачыцца актыўны ўдзел Бунду ў скліканьні першага зьезду РСДРП. Але нацыяналізм, што ўнетрыўся з самага пачатку ў Бундзе, знайшоў вельмі спрыяючую глебу.

Ужо зараз-жа пасьля першага зьезду партыі ў цэнтральным органе Бунду «Арбейтэр Штым» («Голос рабочего») № 11 за 1898 год зьявіліся артыкулы, у якіх разьвіваюцца такія думкі:

«З посьпехам абараняць спэцыяльныя яўрэйскія інтарэсы ня ў сілах агульна-расійская партыйная арганізацыя».

На трэцім зьезьдзе Бунду ў 1899 годзе адзін з дэлегатаў адкрыта заявіў: «Яўрэйскі пралетарыят павінен дамагацца таксама нацыянальнага роўнапраўя. Грамадзянскага роўнапраўя мала для таго, каб яўрэйскі рабочы мог абараняць свае інтарэсы».

У 1900 годзе цытаваную вышэй прамову Мартава Бунд выдаў асобнай брашурай пад назвай «Паваротны пункт у яўрэйскім рабочым руху», якая ставіла сваёй мэтай атрэціць яўрэйскіх рабочых нацыяналістычнай атрутай.

Нацыяналізм і здрадніцтва Бунду прывялі да таго, што на другім зьезьдзе партыі ён высунуў патрабаваньне аб пабудаваньні партыі на федэрацыйным грунце і аб прызнаньні яго адзіным прадстаўніком яўрэйскага пралетарыяту. Калі гэтае патрабаваньне было адхілена, Бунд пакінуў другі зьезд, выйшаў са складу РСДРП і пачаў весьці супроць партыі заціятую барацьбу. Усім вядомы выступленьні Леніна і старой «Искры» супроць нацыяналізму Бунду. Гэта барацьба была перанесена таксама на Украіну, дзе Бунд да 1903 году ня вёў работы. Асабліва гэта барацьба была абвострана ў Беларусі, Літве і Польшчы, — у так званай тэрыторыі Бунду. Паўночна - Заходні камітэт РСДРП і Палескі камітэт, якія арганізавалі цэлы рад груп РСДРП у 1903 годзе, пасьля другога зьезду партыі групавалі вакол сябе найбольш рэвалюцыйныя элемэнты яўрэйскіх рабочых і ім прыходзілася весьці пастаянае змаганьне супроць Бунду.

У 1905 годзе бальшавікамі былі выданы на яўрэйскай мове пракламацыі, праграмы РСДРП і пратаколы 3-га зьезду партыі. У пашісанай да гэтага выданьня Леніным прамове Бунд характарызуецца так:

«Першы зьезд нашай партыі, які адбыўся ўвесну 1898 году, паставіў сабе за мэту стварыць гэта адзінства. Для зьніжэньня якой-бы там ні было думкі аб яе нацыянальным характары партыя назвала сябе ня «рускай», а «расійскай». Арганізацыя яўрэйскіх рабочых — Бунд уступіў у партыю, як аўтаномная частка. На жаль, з гэтага моманту аб'яднаньне яўрэйскіх і неяўрэйскіх сац.-дэм. у адной партыі было зьнішчана. Паміж дзеячамі Бунду пачалі пашыравацца нацыяналістычныя ідэі, якія знаходзяцца ў вострай супярэчнасьці з усім сьветапоглядам сацыял-дэмакратыі. Замест імкненьня да зблізкэньня яўрэйскіх і неяўрэйскіх рабочых, Бунд уступіў на шлях адрыву першых ад другіх, выставіў на сваіх зьездах адмежаванасьць яўрэяў як нацыі. Замест таго, каб весьці далей работу першага зьезду РСДРП у напрамку яшчэ большага ўзмацненьня аб'яднаньня Бунду з партыяй, Бунд зрабіў крок па сваім адзяленьні ад партыі».

«... Другі зьезд РСДРП ня мог, зразумела, прыняць такія ўмовы, бо ў цэлым радзе мясцовасьцяй, напрыклад, у Беларусі яўрэйскі арганізаваны пралетарыят знаходзіцца ў агульнай партыйнай арганізацыі. Ня прымаючы пад увагу гэта, Бунд выйшаў з партыі і гэтым самым парваў адзінства сацыял - дэмакратычнага пралетарыяту».

Наступная эвалюцыя Бунду ўправа поўнасьцю апраўдала характарыстыку, якую даў яму Ленін. У 1905 годзе Бунд уключыў у сваю праграму патрабаваньні аб нацыянальна-культурнай аўтаноміі. У гады рэакцыі ён канчаткова парваў з рэвалюцыйнай і прадстаўляў сабой самае правае крыло ліквідатараў. Супроць бундаўскага нацыяналізму і анартупізму ня раз выступаў Ленін і іншыя выдатныя бальшавікі. На нарадзе ЦК РСДРП у сь

Саюз крыжа і фашысцкай дубінкі

Вынікі наведвання былога Хэйхсканцлера фон-Папэна рымскага папы.

АНТЫСАВЕЦКАЯ ХЛУСЬНЯ ГЕРМАНСКІХ ФАШЫСТАЎ

Грубая фальшыўка германскага тэлеграфнага агенцтва

БЭРЛІН, 15. (БЕЛТА). Германскі друк прабуе скарыстаць пастанову Саўнаркому СССР і ЦК УсеКП(б) аб канчатковым пляне збожжаздачы саўгасамі паўднёвых раёнаў СССР для «абгрунтаваньня» сваёй антысавецкай кампаніі, якая праводзіцца пад лёзунгам аказаньня дапамогі «галадаючым нямецкім сялянам у СССР». З гэтай мэтаю агенцтва **«Тэл. Унион»** пашырае наступную грубую фальшыўку, перадрукаваную ў газэтах: «Афіцыяльна паведамляецца, што ўрад СССР і ЦК кампартыі апублікавалі наступную пастанову: «Перад тварам вялікай галечы ўрад і партыя пастанавілі павялічыць колькасьць падлягаючага здачы збожжа. Усе дзяржаўныя і збожжавыя сялянскія калектывы абавязаны павялічыць колькасьць здаваемага збожжа ў сярэднім на 16-22 проц.». **«Фэлькішэр Бэобахтэр»** не ўпускае выпадку, каб у камэнтарыі да гэтай грубай фальшыўкі заявіць, што «гэты дэкрэт паказвае, катастрафічнае становішча ў СССР» і што ён «дэманструе бяссумленнасьць савецкай сыстэмы».

Канец нацыянал-сацыялісцкай „рэвалюцыі"

БЭРЛІН, 14. (БЕЛТА). Прускі міністар юстыцыі **Кэрль** выдаў цыркуляр, якім устанаўляюцца драконаўскія меры пакараньня за «супраціўленьне правядзеньню агалошанай Гітлерам гаспадарчай лініі». У цыркуляры падкрэсьліваецца, што ўсякія размовы аб працягу нацыянал-сацыялісцкай «рэвалюцыі», становіць сабою патрозу правядзеньню задач, пастаўленых урадам. Кожная спроба «некампэтэнтнага ўмяшаньня ў гаспадарку і мерапрыемствы ўрада «павінна карацца з усёй суровасьцю. Далей у цыркуляры ўказваецца, што той хто супраціўляецца распараджэньням ураду, ці заклікае да супраціўленьня, будзе прысуджацца да суровага турэмнага пакараньня, а «ў выпадку неабходнасьці» у адпаведнасьці з дэкрэтам аб абароне дзяржаў — да сьмерці, ці да катаржных работ і канфіскацыі маемасьці. Пракурорам прапануецца перадаваць гэтыя справы надзвычайным судам.

* * *

БЭРЛІН, 14. (БЕЛТА). У завяршэньне кампаніі, правадзімай нацыянал-сацыялісцкім урадам супроць «некампэтэнтнага ўмяшаньня ў гаспадарку» і накіраванай, па сутнасьці, супроць тых, хто імкнецца хоць-бы часта фармальна прытрымоўвацца ранейшых дэмагагічных абяцаньняў і лёзунгаў нацыянал-сацыялісцкай «рэвалюцыі», — германскі ўрад скасаваў функцыі дзяржаўных камісараў гаспадаркі.

НОВЫЯ ЗАКОНЫ АДНОСНА ВАРОЖАЙ ДЗЕЙНАСЬЦІ ДА ЎРАДУ ГІТЛЕРА

БЭРЛІН 15. (Белта). Учора германскі ўрад зацьвердзіў рад законаў палітычнага і эканамічнага характару. Закон аб канфіскацыі «варожай дзяржаве маемасьці» прадугледжвае канфіскацыю маемасьці ўсіх арганізацый, «якія вядуць варожую ў адносінах да ўраду Гітлера дзейнасьць, а таксама канфіскацыю асабістай маемасьці асоб, якія вядуць за граніцай ці ўнутры краіны работу, накіраваную супроць ураду». Далей зацьверджан закон аб пазбаўленьні германскага грамадзянства асоб, атрымаўшых гэта грамадзянства ў перыяд паміж 9 лістапада 1918 году і 30 студзеня 1933 г., «калі прабываньне такіх асоб у германскім грамадзянстве будзе палічана непажаданым». Апрача таго, могуць быць пазбаўлены грамадзянства асобы, выехаўшыя за граніцу, калі яны сваімі паводзінамі «парушылі свой доўг вернасьці германскай дзяржаве». Закон супроць стварэньня палітычных партый у Германіі прадугледжвае суровыя кары за спробы стварыць якія-небудзь новыя партыі ці аднавіць адну з ранейшых партый.

Новы закон аб адкрыцьці «грамадзкіх ігарных дамоў», на падставе якога ў бліжэйшы час адкрываецца першы такі ігарны дом у Вадан-Бадэне, яркі характарызуе сабою катастрафічнае становішча германскіх фінансаў і тыя мэтады, пры дапамозе якіх урад спадзяецца палепшыць становішча сваіх фінансаў.

Асаблівай увагі заслугоўваюць законы аб «прымусовым картэляваньні» і аб «прынцыпах размеркаваньня падрадаў на пастаўкі дзяржаўным і камунальным органам». Гэтыя законы знаходзяцца ў дыямэтральнай супярэчнасьці з нацыянал-сацыялісцкай «праграмай», якая абвяшчала «самую рашучую барацьбу папаваньню трэстаў». Новы закон дае міністру гаспадаркі Шмідту права прымусовага картэляваньня прадпрыемстваў. Сэнс гэтага закону заключаецца ў тым, каб вызваліць буйныя картэлі і трэсты ад іх дробных канкурэнтаў.

Прадугледжваецца накладаньне вялізарных грашовых штрафаў на прадпрыемствы, якія не падпачаляцца закону аб картэляваньні.

Побач з гэтым законам, які неабходжна даказвае, што ўрад Гітлера праводзіць эканамічную палітыку буйнага капіталу, зацьверджана таксама некалькі законаў, якія павінны стварыць уражаньне, быццам ўрад адстойвае інтарэсы рамесьнікаў і дробнай буржуазіі. З гэтай мэтаю выдан закон аб «абмежаваньні ўжываньня машын у вытворчасьці сігар» і аб забароне універмагам мець рэстараны, каб не ствараць канкурэнцыі рэстаранам, якія належаць дробным прадпрыемцам.

Фашысцкія бандыты расстрэльваюць камуністаў

БЭРЛІН, 15. (БЕЛТА). Учора «пры спробе ўцякаць» былі ЗАСТРЭЛЕНЫ 3 КАМУНІСТЫ, якіх перавозілі ў канцэнтрацыйны лягер у ЗОНЭНБУРГ. Імёны застрэленых не паведамляюцца. У БОКУМЕ таксама «пры спробе ўцякаць» быў ЗАБІТ АКТЫЎНЫ РАБОТНІК КАМПАРТЫІ.

Зьверская расправа германскіх фашыстаў

ВЕНА, 15 (БЕЛТА). «Арбайтэр цайтунг» прыводзіць абураючыя падрабязнасьці аб катаваньнях і забойствах у нацыянал-сацыялісцкіх казармах **у Кэпеніку.** Старшыні аднаго з прафсаюзу—старыку Шмаўсу штурманулі жалезную палкаю пераламалі косьці, а затым павесілі. Яго сын Антон Шмаус быў люта зьбіт, а затым расстрэлян. Іогану Штэлінгу вырвалі валасы, пераламалі пальцы і затым забілі. У карыдорах казарм стаяць лужыны крыві. Каб заглушыць крыкі катуемых, штурмавікі пускаюць у ход маторы матацыкляў.

У адну ноч на 22-е чэрвеня ў Кэпеніку было замучана да сьмерці больш 20 камуністаў і сацыял-дэмакратаў.

Бэльгійскія рабочыя закідалі каменьнямі германскае судно

БЭРЛІН, 13. (БЕЛТА). Газэты паведамляюць, што германскае судно **«Шарлота Шрэдэр»** у часе праходу з Брусэльскага каналу было асыпана рабочымі градам каменьня. Гэта бамбардыроўка ішла на працягу двух гадзін. «На палубе, — піша капітан,— валялася ад 200 да 300 клгр. каменьняў».

Лік бяздомных бязупынна расьце

ВАРШАВА 15. (Уласн. інф. «Зьвязды») сацыял-фашысцкі «РОБОТНІК» паведамляе, што паводле статыстычных даных магістрату, на 19 чэрвеня ў Варшаве было 290 СЕМ'ЯЎ З 3.901 АСОБЫ, якія жывуць пад адкрытым небам, на вуліцы, або начуюць у піўных, на дахах дамоў, а таксама блукаюць па акраінах гораду.

«Гэта сем'і,—піша газэта,—выкінутыя з дамоў на падставе судовага прысуду, на вялікую запазычанасьць па кватэрнай плаце якую беспрацоўныя не маглі выплаціць больш, чым за паўтары гады».

Лік ня маючых даху над галавой з кожным днём павялічваецца. ТАК, АД 19 ЧЭРВЕНЯ ДА 1 ЛІПЕНЯ Ў АРМІЮ БЯЗДОМНЫХ ПРЫБЫЛО 18 СЕМ'ЯЎ З 82 ЧАЛАВЕК, АД 1 ЛІПЕНЯ ПРЫБЫЛО 15 СЕМ'ЯЎ З 78 ЧАЛАВЕК. Такім чынам, лічба бяздомных складае 953 СЯМ'І—4.001 ЧАЛАВЕК.

Трэба зазначыць, што гэтыя «статыстычныя» даныя значна паменшаны газэтай і сапраўдны лік бяздомных далёка большы. Такое-ж становішча і ў іншых буйных гарадох Польшчы.

Польскі друк аб антыпольскай прапагандзе германскіх фашысцкіх арганізацый

ВАРШАВА, 13. (БЕЛТА). У сувязі з адбыўшымся 22 чэрвеня ў Кенігсбэргу арганізацыйным сходам германскага саюзу **«Дэйчэ Остэн»**, які ўзяў на сябе фашысцкую прапаганду сярод немцаў усходня - эўрапэйскіх краін, польскі друк падкрэсьлівае яркі антыпольскі характар прапагандысцкай дзейнасьці гэтай арганізацыі.

Мэтаю саюзу зьяўляецца, па думцы газэты, падрыхтоўка глебы для будучых калёнізацыйных плянаў Германіі на Усходзе. **«Кур'ер поранны»** лічыць, што польская грамадзкасьць, а ў першую чаргу пагранічнае сельскае насельніцтва, павінна прыняць асаблівыя меры супроць пашырэньня германскай прапаганды на польскай тэрыторыі.

Чэхаславацкія ваенныя заводы працуюць з поўнай нагрузкай

ПІЛЬЗЭН, 15. (Уласн. інфарм. «Зьвязды»). Ужо некаторы час, як ваенныя заводы «ШКОДА» (Чэха-Славакія) працуюць узмоцненым тэмпам. Цэхі гармат і гранат працуюць пры поўнай нагрузцы. Другія чэскія ваенныя заводы **у БРУНЬНІ, СТРАКОНЬНІЦЫ і ПРАЗЕ таксама павялічылі выпуск «прадукцыі». Авіяцыйныя заводы атрымалі заказ на 80 аэраплянаў. Значнае ажыўленьне адзначаецца таксама і на сталяліцейных заводах Чэха-Славакіі, атрымаўшых вялікія заказы ад ваеннай прамысловасьці.**

Лёнданская канфэрэнцыя ад кладаецца на невакрэсьлены час

ЛЁНДАН, 15. (ТАСС). На пасяджэньні «Малога бюро» канфэрэнцыі прынята прапанова **Макдональда** аб скліканьні заключнага пленарнага пасяджэньня сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі на 27 ліпеня. Потым канфэрэнцыю прапануецца распусьціць «на канікулы», г. зн., па просту гаворачы, адкласьці на неакрэсьлены час.

Замежная хроніка

* 9-га ліпеня ў прафэктуры Коці (Японія) арыштавана 30 асоб па абвінавачаньні ў камуністычнай дзейнасьці.

* Колькасьць беспрацоўных у Індыі, паводле паведамленьня добра інфармаваных ангельскіх газэт, дасягнула 40 мільёнаў. Паколькі Індыя мае 318 мільёнаў жыхароў, лік беспрацоўных складае 125 на кожную тысячу жыхароў.

* Учора ў 5 гадз. па маскоўскаму часу пілот **Лаваневускі** вылянеў з **Хабараўску ў Анадыр** на самалёце «СССР—Н-8» для дапамогі амэрыканскаму лётчыку **Джэмсу Матэрну.**

Савецкая судовая сыстэма ў барацьбе за ўраджай

Радыё-даклад нам. пракурора Саюзу тав. Вышынскага

МАСКВА 14 (Белта). Культтэхпроп Усесаюзнага радыёкамітэту пры ОНК СССР 13 ліпеня арганізаваў радыёдаклад нам. пракурора Саюзу т. Вышынскага на тэму: «Савецкая судовая сыстэма ў барацьбе за ўраджай».

«У дзікавінай і напружанай барацьбе за першы ўраджай другой вялікай пяцігодкі—гаворыць тав. Вышынскі,—вялізарная роля і ролі меншы вялізарная адказнасьць выпадае на органы савецкай юстыцыі, у першую чаргу на органы савецкай пракуратуры.

Уборачная кампанія гэтага году праходзіць у новых умовах, у абставінах калгачковай перамогі калгаснага ладу, якая абумоўлене масчымасьць пераняцьня ў цяперашні час цэнтру цяжару ў рабоце судовых, пракурорскіх і карных органаў у галіну масавую, арганізацыйна-палітычную. Гэта новая абстаноўка патрабуе паляпшэньня і рацыяналізацыі работы органаў пракуратуры і органаў расьсьледваньня. Гэта новая абстаноўка патрабуе дапасаваньня такіх мэтадаў, якія забясьпечвалі-бы шырокую грамадзка-палітычную падрыхтоўку рэпрэсыўных удараў па дрэнежніках па арганізатарах і натхнільнікам злачынства і раскраданьня дзяржаўнай сацыялістычнай уласнасьці.

У новых абставінах трэба правяць выключную ўвагу да ўсіх тых разнастайных і тонкіх мэтадаў барацьбы, якія разгортвае там і тут клясавы вораг, кідаючы на сацыялістычныя палі сваю агэнтуру ў асобе ўсіх гэтых стрыгуноў, «парыкмахэраў» і г. д. і г. д. з ножніцамі ў руках і мяшкамі за сьпіною.

Клопаты аб арганізацыі мас, аб стварэньні масавага грамадзкага руху за ахову ўраджаю сучроць усякіх замахаў клясавага ворага, гэта пярвейшая і важнейшая задача, якая зараз павінна стаяць у парадку дня ня толькі перад гаспадарчымі органамі і ўстановамі, але і перад магутным вагаром пралетарскай дыктатуры—усёй сыстэмай судова-пракурорскіх і карных органаў. Барацьба за стварэньне такой грамадзкай атмасфэры, якая сама рабіла-б немагчымым замах, на сацыялістычную уласнасьць—вось на чым зараз павінны ўпарта і ўзмоцнена працаваць нашы пракуроры.

Асаблівасьць сучаснай абстаноўкі заключаецца ў неабходнасьці ўмелага спалучэньня мэтаду перакананьня, грамадзка-выхаваўчага ўзьдзеяньня на няўстойлівыя элемэнты сярод працоўных—з аднаго боку і бязьлітаснага ўдару і канчатковага разгрому ўсіх апошніх рэштак клясавага ворага—з другога.

Асаблівае значэньне задач па ахове сацыялістычнай уласнасьці ў радзе усіх іншых задач органаў пракуратуры падкрэсьлена ў апошні час такім выключным па сваёй выжнасьці актам, якім зьяўляецца пастанова ЦВК і СНК СССР аб устанаўленьні Саюзнай пракуратуры.

Ураджай—гэта ёсьць адзін з важнейшых элемэнтаў нашай гамадзкай уласнасьці. Добра сабраць ураджай і добрасумленна здаць усё, што належыць з ураджаю дзяржаве—вось задача, выкананьня якой набывае зараз перыфэрыйнае значэньне.

Як-жа стаіць справа ў гэтых адносінах у рачаіснасьці? Як падрыхтаваліся мы, у тым ліку органы пракуратуры, да збору ўраджаю, да барацьбы супроць вялікіх і малых спэкулянтаў, кулакоў, раскрадальнікаў народнага дабра? Цэлы рад фактаў гаворыць аб дрэнай падрыхтоўцы. На Ніжняй Волзе у розных раёнах—Клецкім, Васкрасенскім, В. Карабулакскім—выяўлены даныя, якія гавораць аб злачынных пробах шляхам скрыцьця фактычнага ўраджаю і утойкі сапраўды засеянай плошчы, ашукаць пралетарскую дзяржаву. Асабліва ганебнай і яркай ілюстрацыяй такога злачыннага ашуканства, простага шкодніцтва зьяўляецца справа адэскага збожжатрэсту. І што яшчэ горш, органы пракуратуры ня ўсюды прымаюць неабходныя меры барацьбы супроць спроб кулацтва сарваць правядзеньне збожжаўборачнай.

Мы маем факты злачынай неўважлівасьці і нядбайнасьці ў справе аховы ўраджаю, калі вартаўнікамі ставяць сьляпых і слабых старыкоў, калі зусім пакідаюць калгасныя і саўгасныя палі без усякай аховы.

На ўсіх гэтых недахопах, пакуль яшчэ не позна, трэба завастрыць увагу. Трэба прыняць усе меры да таго, каб перабудаваць усю работу, ліквідаваць прарывы, васпоўніць хібы і даць бязьлітасны адпор клясаваму ворагу. Тут патрабуецца найвялікшая ўвага, клясавая пільнасьць з боку пракурорскага нагляду. Ад яго патрабуецца найвялікшая гнуткасьць і найвялікшая хуткасьць і рашучасьць дзеяньня.

Перад органамі пракуратуры больш чым калі-небудзь стаіць задача хуткага, рашучага і ўмелага мана'ўраваньня. Трэба біць умела і асьцярожна, сачыць за тым, каб нашы ўдары не закранялі тых, да якіх яны не павінны адносіцца, не падалі-б міма тых галоў, на якіх яны павінны біць бязьлітасна.

Дабіць апошнія рэшткі клясавага ворага, разьвеяць іх у прах і вывесьці справу ўраджаю першага году другой пяцігодкі, справу збожжаставак для дзяржавы на шырокую сталбавую дарогу пераможнага завяршэньня—вось задача, якая стаіць перад усёй сыстэмай і органамі савецкай юстыцыі. З гэтай задачай мы павінны справіцца ва што-б там ні было. Партыя гэтага патрабуе і партыя не дарае ніводнай гадзіны прамаруджаньня, ніводнай памылкі, якая перашкодзіць пасьпяховаму ажыцьцяўленьню гэтай задачы».

Вячэрні музычны тэхнікум у Гомелі

У Гомелі арганізуецца **вячэрні музычны тэхнікум** на 60 чалавек.

Паводле пастановы СНК БССР вярбоўка вучняў у гэты тэхнікум павінна праводзіцца ў асноўным за лік студэнтаў былога гомельскага дзеннага музтэхнікуму.

ПАПРАУКА

У пастанове СНК СССР і ЦК УсеКП(б) «Аб канчатковым пляне збожжаздачы саўгасамі па паўднёвых раёнах СССР» (гл. «Зьвязда» ад 15 ліпеня, № 154) у пункт 2 укралася апячатка. Трэба чытаць:

	Саюзнасен невод	У тыс. пуд Астатнія саўгасы
СЯРЭДНЯЯ АЗІЯ	—	410
ЗАКАЎКАЗЬЗЕ	40	275

(ТАСС).

„ЯГОР БУЛЫЧАЎ" І ІНШ.

Расійскі дзяржаўны тэатр БССР—у Менску

Расійскі Дзяржаўны Тэатр БССР, на арганізацыю якога паклаў шмат зёльнасьцяй і сіл яго кіраўнік **Кумэльскі**, робіць свае паказы менскаму гледачу ня першы раз. Яго мальовічныя пастаноўкі сваёмы многім пралетарскім цэнтрам БССР.

Гэты тэатр даволі даўгі час існаваў на правох аматарскага тэатру. Але гэта ніколькі не адбілася на тэй сур'ёзнасьці, сталасьці і прадуманасьці, з якімі ён і ў той час падыходзіў да вырашэньня тэатральных пытаньняў, да глыбокага раскрыцьця і паказу рознастайных вобразаў савецкай рэчаіснасьці на сцэне. І цяпер, калі тэатр ужо некаторы час працуе як дзяржаўны тэатр БССР, трэба асабліва падкрэсьліць, што гэта моцны калектыў актораў з саліднай тэатральнай культурай, з шчырым жаданьнем прымаць удзел у грандыёзнай будоўлі сацыялізму ў нашай краіне.

Пра гэта сьведчаць тыя вострa-адточаныя рэвалюцыйныя паказы, якія наш працоўны глядач бачыў у пастаноўцы рускага дзяржаўнага тэатру раней.

Аб гэтым гаворыць і тая сур'ёзнасьць і сьпеласьць, якія тэатр праявіў у пастаноўцы вельмі глыбокай і грунтоўнейшай рэчы—п'есы вялікага рэвалюцыйнага мастака слова **Максіма Горкага —«Ягор Булычаў»**, якою распадаў свае гастролі ў Менску тэатр. Вялікая заслуга тэатру перад менскім гледачом ужо ў тым, што ён упяршыню паказаў новую п'есу М. Горкага.

Адсутнасьць рэзкіх эпадворных сітуацый і спэцыфічных тэатральных трукаў і эфэктаў у п'есе Максіма Горкага акрэсьлілі глыбокі падыход тэатру да паказу «Ягора Булычава».

Дзея п'есы разгортваецца на фоне надыходзячай лютаўскай рэвалюцыі. Ужо чуцён жалезны поступ пралетарскай дыктатуры. І вось на гэтым фоне Максім Горкі здолеў зрабіць найвялікшае мастацкае абагуленьне—паказаць праз сьмерць аднаго чалавека Ягора Булычава пагібель цэлай грамадзкай сыстэмы—капіталістычнага ладу.

Асноўным зьместам п'есы зьяўляецца Ягор Булычаў—капіталіст, які паходзіць з нізоў. Будучы сынам батрака, які ганяў плыты, Булычаў, дзякуючы сваёй энэргіі, прадпрымальнасьці, «выбіўся ў людзі»—сам стаў капіталістам. Хвароба—рак печані—падточвае арганізм калісьці моцнага дужага чалавека, што «ў маладосьці такім арлом быў». Горкі бярэ галоўным персанажам сваёй п'есы іменна жывога, дужага, разумнага чалавека, які хоць і жага, разумнага чалавека, які хоць і бачыць сапраўды агідны твар сваёй аджываючай клясы, але застаецца верным яе сынам, хоць праз увесь час глядачу яго саркастычныя, гіранічныя рэплікі па адрасе прадстаўнікоў сваёй клясы.

Гэтым тыпам Максім Горкі па-майстэрску сымбалічна прадэманстраваў перад гледачом пагібель рускага капіталізму, хоць гэта сымболіка і не выпукленна аўтарам наумысна.

Булычаў лабіўся багацьця праз ашуканства, абкрадваньне, ограбленьне чужой працы. Лаючы свайго прыказчыка злодзеем, Булычаў прызнае законнасьць злачынства, бо ўся-ж капіталістычная сыстэма пабудована на маштэляцтве і злодзействе. Яму вельмі падабаецца і ашуканства трубача, які абяцае за грошы вылечыць яго ігрой на трубе ад хваробы печані.

Булычаў іранізуе і зьдзекуецца над папом і ўсім сьвятым, як-бы ня верыць у бога, але адначасова ў яго недзе яшчэ іскрыцца вера ў розныя забабоны, праз якія ён яшчэ думае вярнуць сабе асужанае на сьмерць жыцьцё.

Булычаў ня можа не разумець усёй агіднасьці і асужанасьці ўсяго грамадзкага ладу, у якім ён жыве. І ён часта выказвае такую думку: «Не на тэй вуліцы жыву. У чужыя людзі трапіў, гадоў пяць жыву. У чужыя людзі... »—скардзіцца ён сваёй пабочнай дачцы Шурцы, якой ён аддае ўсе свае бацькаўскія пяншчоты і ласкі.

Вакол галоўнага стрыжаню п'есы—асобы Ягора Булычава—навіхаюцца ўсе тэтыя знахары, шаптуны, паны, манашкі, кущы і іншыя прадстаўнікі аджываючай капіталістычнай сыстэмы.

Сцэнка перад агчыненьнем заслоны з чыткай газэт уводзіць гледача адразу ў тую эпоху, якую малюе ў п'есе Максім Горкі.

Пастаноўка мае свае недахопы, некаторы налёт правінцыяльшчыны. Месцамі няўдалыя музычныя ілюстрацыі, няўдалыя харавыя ўступленьні, якія не ўзаходзяць у тканіну спэктаклю як яго арганічная частка.

Ня гледзячы на гэтыя дробныя хібы, тэатр замысел аўтара добра зразумеў і даў поўнакроўны спэктакль. Багаты слоўны матар'ял аўтара, рэжысэрскае афармленьне і ігра актораў зьліваюцца ў адно цэлае, даюць поўнае сацыяльнае значэньня відовішча.

Сярод выканаўцаў трэба ў першую чаргу адзначыць кіраўніка тэатру **Кумельскага**, які даў яркі, прадуманы вобраз Ягора Булычава.

Пераконвае вобраз Глафіры ў артыстцы **Захаравай** і Аксініні—жонкі Булычава—у артыстцы **Боскарэвай.**

Шурка—пабочная дачка Булычава, якую ён моцна любіць і якая сымбалізуе сум Булычава па страчанай сувязі з народнымі вушчамі, з якіх ён выйшаў,—гэты багаты вобраз «разумнай як чорт» дзяўчыны адрымаўся бледнаватым у выкананьні — артысткі **Баскакавай.**

Апулам-жа ўвесь калектыў, які прымаў удзел у п'есе, справіўся са сваёй задачай.

Грамадзкія арганізацыі менскіх заводаў і фабрык павінны наладзіць масавыя паходы на гэты спэктакль, каб рабочыя масы маглі азнаёміцца з найлепшым творам савецкай драматургіі.

П. Жарскі

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Мэнтарком КП(б)Б склікае сьвяньне 16-га ліпеня г. г., а 12-й гадз. у ГК у пакоі № 45 (аргаддзел) нараду трыкутнікаў з наступным парадкам дня:

1. Выкананьне прамфінпляну па валавой прадукцыі за першае паўгодзьдзе 1933 г.

2. Інфармацыя з месц.

Выклікаюцца трыкутнікі па лініі Нар камгасапраму заводаў імя Варашылава, «Камунар», «Ударнік», цагельня № 1, № 3, № 8.

Па лініі Наркамснабу 16-VII г. г. а 6-й гадз. увечары пакой № 45 (аргаддзел) выклікаюцца трыкутнікі заводаў і фабрык «Чырвоны золак», «Беларусь», «Беларуска», шчотачная фабрыка, «Пралетары», шчацінная фабрыка, мясакамбінат, сьпіртасавод.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ—СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ

Сваячасова і бяз страт убраць ураджай!
Датэрмінова паставіць збожжа дзяржаве!

СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЯ ЛІТАРАТУРА

аб УБОРЦЫ УРАДЖАЮ і аб ПАСТАУЦЫ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ.

ВЫШЛА З ДРУКУ І ЕСЬЦЬ У ПРАДАЖЫ:

I. ЛІТАРАТУРА ПАЛІТЫЧНАЯ.

АБ ПАСТАЎЦЫ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ. АБ РАБОЦЕ Ў ВЁСЦЫ.

СТАЛІН І. — 1) Аб рабоце ў вёсцы. 2) Прамова на 1 Усесаюзным Зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў. Стар. 80, тыр. 10.000, 1933 г., ц. 30 к.

СТАЛІН І., ПОСТЫШАЎ П. і ГІКАЛО М. — Прамовы аб рабоце ў вёсцы. Стар. 102, тыр. 20.000, 1933 г., ц. 40 к.

КАГАНОВІЧ Л. — Мэты і задачы палітаддзелаў МТС і саўгасаў. Стар. 46, тыр. 6.000, 1933 г., ц. 30 к.

ПОСТЫШАЎ П. і КУЙБЫШАЎ В. — Мабілізуем масу на сваячасовую пастаўку збожжа дзяржаве. (Выходзіць в друку).

НОВАЯ АБСТАНОЎКА — новыя мэтады работы ў вёсцы. (Культпроп ЦК КП(б)В). Стар. 32, тыр. 25.000, 1933 г., ц. 15 к.

БЛЕК-НОТ АГІТАТАРА № 12 (27). Аб палітаддзелах МТС і саўгасаў і аб калгаснай ячэйцы. (Агітмас ЦК КП(б)В). Стар. 44, тыр. 12.000, 1933 г. ц. 20 к.

ІОАКАЎ Г. — Пастаўка збожжа дзяржаве—першапачатковая задача. Стар. 16, тыр. 25.000, 1933 г., ц. 10 к.

БЯРКОЎСКІ Н., ЗАГАРОЛЬСКІ А. і МІРКІН В. — На барацьбу са стратамі пры ўборцы і абмалоце зерневых куль тур. Стар. 32, тыр. 25.000, 1933 г., ц. 15 к.

АБ БОРЬБЕ ПАПАРУ І АРГАНІЗАЦЫІ ЎБОРКІ ЗЕРНЕВЫХ. (Пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б) і пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)В). Стар. 36, тыр. 10.000, 1933 г., ц. 20 к.

ВАЖНЕЙШЫЯ ДЫРЭКТЫВЫ ЎРАДУ СССР і БССР па абавязковай пастаўцы збожжа, мяса, бульбы і інш. (Стар. прадуктаў—Зборнік. (Выходзіць з друку).

ЛІШКОЎСКІ І СВЯНЦІЦКІ. — У дапамогу дазорам высокага ўраджаю. (Выходзіць в друку).

ЖОЛУДАЎ. — Аб уборцы і хлебанарыхтоўках. (Выходзіць з друку).

СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫ ПАДАТАК НА 1933 ГОД.

СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫ ПАДАТАК НА 1933 ГОД. (Пастановы ЦВК і СНК СССР, ЦВК і СНК БССР і НКФ БССР). Стар. 84, тыр. 6.000, 1933 г., ц. 30 к.

БАБІЦКІ. — Аб сельска-гаспадарчым падатку на 1933 год. Стар. 50, тыр. 5.000, 1933 г., ц. 25 к.

РУБІН. — Сельска-гаспадарчы падатак на 1933 год. Стар. 36, тыр. 7.000, 1933 г., ц. 20 к.

ЗА ПІЛЬНУЮ АХОВУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ МАЕМАСЬЦІ!

ОРГАНІЗАЦЫЯ ПРОЦІПАЖАРНАЙ АХОВЫ Ў САЎГАСАХ І КАЛГАСАХ. Зборнік афіцыяльных матар'ялаў. Нармальныя статуты і інструкцыі для пажарных дружын. (Кіраўніцтва пажарнай аховы НКГ БССР). Стар. 28, тыр. 15.000, 1932 г., ц. 12 к.

МАЙЛЛАЎ Ф. — Барацьба з пажарамі ў саўгасах і колгасах і на МТС. Стар. 64, тыр. 5.000, 1932 г., ц. 30 к.

ПАПЯРЭДЖВАЙЦЕ ПАЖАРЫ — беражыце сацыялістычную гаспадарку! (Плякат). Тыр. 6.000, 1932 г., ц. 30 к.

АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ Ў КАЛГАСЕ.

ПАСТАЯННАЯ БРЫГАДА НА ЎБОРЦЫ І АСЕНЬНЯЙ СЯЎБЕ. Стар. 72, тыр. 7.000, 1932 г., ц. 25 к.

ПАНІН А. — Даведнік брыгадзіра па вылічэньні працадзён. Стар. 24, тыр. 10.000, 1933 г., ц. 15 к.

ПАНІН А. — Даведнік брыгадзіра па вылічэньні працадзён. (Выд. II—друкуецца).

ПАЛАЖЭНЬНЕ аб пастаяннай вытвор чай брыгадзе і рабоце брыгадзіраў у калгасах. (Выходзіць з друку).

ПАЛАЖЭНЬНЕ аб арганізацыі працы ў МТКФ БССР на 1933 год. (НКЗ БССР). Стар. 52., тыр. 10.000, 1933 г., ц. 25 к.

ПАЛАЖЭНЬНЕ аб арганізацыі працы ў СТКФ БССР на 1933 год. (НКЗ БССР), Стар. 34, тыр. 10.000, 1933 г., ц. 20 к.

ЖУЙКО І. — Улік працы ў колгасах. Тыр. 10.000. (Выходзіць з друку).

БАРЫСЕВІЧ АЛ і інш. Колгасная брыгадзе—сталы вытворчы вучастак. Тыр. 5.000. (Выходзіць з друку).

АХОВА ЗДАРОЎЯ І ГРАМАДЗКАЕ ХАРЧАВАНЬНЕ.

ЭНЦІН Н. — Пакалечаньні (траўматызм) пры с.г. работах і як папярэдзіць гэтыя пакалечаньні. Стар. 24, тыр. 3.000, 1933 г., ц. 20 к.

ГОРБАЧ. — Савецкая ахова здароўя і роля ўрача ў пасяўной і ўборачнай кампаніі. Стар. 50, тыр. 5.000, 1933 г. (Выходзіць з друку).

РАДЭР А (д-р). — Арганізацыя грамадзкага харчаваньня ў сацыялістычным сэктары сельскае гаспадаркі (колгасах, саўгасах і МТС). Стар. 86, тыр. 3.000, 1933 г., ц. 35 к.

II. ЛІТАРАТУРА АГРАТЭХНІЧНАЯ.

УБОРКА І ПЕРШАПАЧАТКОВАЯ АПРАЦОЎКА.

АГРОТЭХНІЧНЫЯ ПРАВІЛЫ па барацьбе са стратамі пры ўборцы і першапачатковай выпрацоўцы ільну і канапель. Стар. 32, тыр. 15.000, 1932 г., ц. 10 к.

РАБОЧАЯ ПРОГРАМА па першапачатковай апрацоўцы ільну і канапель. Стар. 20, тыр. 5.000, 1932 г., ц. 15 к.

ДОНЧАНКА А. За лепшую першапачатковую апрацоўку ільну! Стар. 64, тыр. 5.000, 1932 г., ц 55 к.

ВЫСОКАСТРОЎСКІ А. і МІХАЙЛАЎ І. — Расьціў, мяцьцё і трапаньне лёну і канапель у калгасах. (Выд. II — перапрацаванае). БССР. Стар. 60, тыр. 6.000, 1932 г., ц. 30 к.

УБОРКА, ХАВАНЬНЕ І СІЛАСАВАНЬНЕ БУЛЬБЫ.

ЗА ПРАВІЛЬНУЮ УБОРКУ БУЛЬБЫ! (Плякат-лістоўка). Тыр. 15.000, 1932 г., ц. 30 к.

ЗА ПРАВІЛЬНАЕ ХАВАНЬНЕ БУЛЬБЫ! (Плякат-лістоўка). Тыр. 15.000, 1932 г., ц 20 к.

ГРЫХУЦКІ М. — Рацыянальнае захаваньне бульбы ў БССР. Стар. 48, тыр. 5.000, 1933 г., ц. 60 к.

ЖУКОЎСКІ Д — Хаваньне і перавозка бульбы. Стар. 44, тыр. 5.000 1931 г., ц. 20 к.

ПРЫГАТАВАНЬНЕ І СКАРМЛІВАНЬНЕ СІЛОСАВАНАЙ БУЛЬБЫ. (З даданкам інструкцыі аб сілосаванай бульбы). Стар 28, тыр. 4.000, 1933 г., ц. 35 к.

САВАЧЭНКАЎ П. Сілосаваньне бульбы. Стар. 48, тыр. 4.000, 1932 г., ц 25 к.

МЭХАНІЗАЦЫЯ С.-Г. РАБОТ.

МЭХАНІЗАЦЫЯ ЎБОРКІ ЎРАДЖАЮ. (Зборнік). Стар. 136, тыр. 15.000, 1931 г., ц. 30 к.

ІНСТРУКЦЫІ па догляду за трактарамі і с.-г. машынамі. Стар. 100, тыр. 8.000, 1933 г., ц. 45 к.

ВЭЖНЕЎ С., ЦЮЛЯЕЎ В. і інш. Даведнік трактарыста. Стар. 194, тыр. 3.000, 1933 г. ц. 1 р. 45 к., пер. 25 к.

ЮДЗІН А. — Правілы догляду сельскагаспадарчых машын. Стар 68, тыр. 10.000 1931 г. ц. 30 к.

ЮФЭРАЎ Н. — Сельскагаспадарчыя машыны. Стар. 116, тыр. 3.000, 1932 г., 1 р. 10 к.

III. ЛІТАРАТУРА НА МОВАХ НАЦМЕНШАСЬЦЕЙ.

НА ЯЎРЭЙСКАЙ МОВЕ.

СТАЛІН І., ПОСТЫШАЎ П. і Г